




*Дай, Божа, памяці... Дай...*
*Ды не салодкай той,*
*Што клеіць вусны маной*
*Пра абяцаны рай.*

*Дай, Божа, памяці той,*
*Што ў грудзях пячэ,*
*Вочы бяссонне сячэ,*
*Ходзіць, як здань, за мной.*

*Дай не забыць крыжоў*
*Ў скоранай сон-траве:*
*Неруш той ажыве*
*І адгукнецца зноў.*

# «ЯКІМ ЧЫНАМ УШЧАМЛЯЮЦЦА ПРАВЫ ДЗІЦЯЦІ, КАЛІ СЯМ'Я З МЕНШАЙ ПА ПЛОШЧЫ КВАТЭРЫ ПЕРАЕДЗЕ Ў БОЛЬШУЮ?»

***Жыхарка горада Бялынічы з 2007 года стаяла ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў на агульных падставах. Зараз будуецца ўжо першы паверх дома, у банку трэба адкрываць крэдытную лінію. Для гэтага туды трэба падаць пакет дакументаў. Адзін з патрэбных дакументаў натарыус адмовілася падпісваць.***

***Справа ў тым, што зараз ва ўласнасці заяўніцы маецца кватэра (агульнай плошчай 40 кв.м). 1/2 у ёй належыць сыну заяўніцы (якому зараз 17 гадоў), другія 1/2 — самой жанчыне. На палове заяўніцы прапісаныя яшчэ муж і 6-гадовая дачка. Каб пабудаваць новую кватэру (60 кв.м), цяперашняе жыллё трэба прадаць. Натарыус кажа, што ў гэтым выпадку ўшчэмленыя правы дзіцяці. Маўляў, чакайце, пакуль сыну не споўніцца 18 гадоў. Але ў гэтым выпадку сям'я рызыкуе страціць сваю чаргу і застацца ўвогуле без большай па плошчы кватэры на неакрэсленую перспектыву.***

***Прадаць кватэру трэба, каб не было лішніх метраў. На кожнага чалавека крэдытуецца 20 «квадратаў». У выпадку валодання цяперашняй кватэрай і аднaчасовым будаўніцтве новага жылля выходзіць у суме 100 квадратных метраў, 20 з якіх з'яўляюцца лішнімі. Чытачка пытаецца: якім чынам ушчамляюцца правы дзіцяці, калі сям'я з меншай кватэры пераедзе ў большую па плошчы? На мясцовым узроўні розныя спецыялісты па-рознаму адказваюць на гэтае пытанне. Між тым для канчатковага вырашэння пытання ў сям'і засталося зусім мала часу.***

Рэдакцыя звязалася з Міністэрствам юстыцыі, папрасіла аператыўнай дапамогі, улічваючы абставіны заяўнікаў. Адказ з галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва міністэрства паступіў хутка.

«...У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 кастрычніка 2001 года №1605 Міністэрства юстыцыі з'яўляецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў сферы юстыцыі. Дача афіцыйных тлумачэнняў дзейнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, а таксама праваўжывальнай практыкі не ўваходзяць у кампетэнцыю Міністэрства юстыцыі.

...Пытанні прадастаўлення льготных крэдытаў і аднаразовых пазык на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў аднесеныя да кампетэнцыі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва і падпарадкаваных яму тэрытарыяльных органаў. Разам з тым лічым магчымым прывесці асобныя нормы заканадаўства, якія рэгулююць закранутыя ў вашым звароце пытанні.

Парадак прадастаўлення грамадзянам ільготных крэдытаў і аднаразовых пазык на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў рэгулюецца Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 года №185 «Аб прадастаўленні грамадзянам ільготных крэдытаў і аднаразовых пазык на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў» (далей — Указ №185).

Так, згодна з падпунктам 1.7 пункта 1 Указа, тыя памеры агульнай плошчы жылога памяшкання, якія прымаюцца ў разлік нармуемых для вызначэння велічыні льготнага крэдыту пры будаўніцтве (рэканструкцыі) жылога памяшкання ў населеным пункце па месцы жыхарства, вызначаюцца за вылікам агульнай плошчы жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ва ўласнасці грамадзяніна і членаў яго сям'і ў населеным пункце па месцы жыхарства (у тым ліку агульнай плошчы жылых памяшканняў, якая прыпадае на долі ў праве агульнай уласнасці на жылыя памяшканні, якія належаць грамадзяніну і членам яго сям'і), а таксама агульнай плошчы жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ва ўласнасці і былі адчужаны грамадзянінам і (або) членамі яго сям'і ў населеным пункце па месцы жыхарства на працягу 3 гадоў да заключэння крэдытнага дагавору (у тым ліку агульнай плошчы жылых памяшканняў, якая прыпадае на долі ў праве ўласнасці на жылыя памяшканні, якія належалі і былі адчужаны грамадзянінам і (або) членамі яго сям'і на працягу 3 гадоў да заключэння крэдытнага дагавору).

Між тым, згодна з названым вышэй падпунктам Указа №185, пры заключэнні з банкам крэдытнага дагавору і ў выпадку прыняцця грамадзянінам-крэдытаатрымальнікам і (або) членамі яго сям'і, уключанымі ў спісы на атрыманне льготных крэдытаў, абавязку па продажы наяўнага ва ўласнасці жылога памяшкання і па кірунку выручаных сродкаў на датэрміновае пагашэнне льготнага крэдыту, разлік нармуемых памераў агульнай плошчы жылога памяшкання для вызначэння велічыні льготнага крэдыту ажыццяўляецца без уліку наяўнага ва ўласнасці грамадзяніна і (або) членаў яго сям'і жылога памяшкання. Пры гэтым на датэрміновае пагашэнне накіроўваюцца выручаныя сродкі ў суме велічыні льготнага крэдыту, прадастаўленага на будаўніцтва (рэканструкцыю) агульнай плошчы жылога памяшкання, якая перавышае нармуемыя памеры агульнай плошчы жылога памяшкання для вызначэння велічыні льготнага крэдыту, вызначаныя за вылікам агульнай плошчы жылога памяшкання, наяўнага ва ўласнасці крэдытаатрымальніка і (або) членаў яго сям'і, але не вышэй ацэначнага кошту названага жылога памяшкання.

Што датычыцца сітуацыі, выкладзенай у звароце, лічым магчымым адзначыць, што, у адпаведнасці з артыкулам 89 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і, бацькі маюць права здзяйсняць ад імя дзіцяці ва ўзросце да 14 гадоў маёмасныя здзелкі, даваць згоду на здзяйсненне здзелак з дзецьмі ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў, а таксама кіраваць маёмасцю дзіцяці да дасягнення ім паўналецця як законныя прадстаўнікі. Пры гэтым бацькі не маюць права без згоды органа апекі і папячыцельства адчужаць, аддаваць у заклад маёмасць, якая належыць дзіцяці.

Акрамя таго, у адпаведнасці з артыкулам 123 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь, адчужэнне жылога памяшкання, у якім пражываюць непаўналетнія члены сям'і ўласніка, дапускаецца толькі са згоды органа апекі і папячыцельства. Такім чынам, калі заяўніцай будзе прынятае рашэнне аб продажы жылога памяшкання, ёй неабходна будзе атрымаць згоду органа апекі і папячыцельства, у якасці якога выступае мясцовы выканаўчы і распарадчы орган.

Згодна з пунктам 1.1.3. Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 красавіка 2010 года «Аб адміністрацыйных працэдурах, якія ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па зваротах грамадзян», дача згоды на адчужэнне жылога памяшкання, у якім пражываюць або маюць права на пражыванне непаўналетнія, або якое належыць непаўналетнім, ажыццяўляецца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам у тэрмін 15 дзён са дня падачы звароту, а ў выпадку запыту дакументаў і (або) звестак ад іншых дзяржаўных органаў, іншых арганізацый — на працягу 1 месяца.

Між тым паведамляем, што ў сітуацыі, што разглядаецца, па сутнасці патрэбна юрыдычная кансультацыя з разглядам праваўстаноўчых дакументаў. У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб адвакатуры», для аказання юрыдычнай дапамогі прапануем заяўніцы звярнуцца ў юрыдычную кансультацыю».

**P.S.** *Пакуль мы чакалі адказу з міністэрства, заяўніца таксама не сядзела, склаўшы рукі. Адным з варыянтаў было прапісаць да сябе маці. Аднак потым высветлілася, што ў гэтым выпадку яе кватэра дадаецца да жылой плошчы чытачкі і праблема лішніх метраў усё роўна застанецца. Між тым, паводле слоў жанчыны, у бліжэйшы час будаваць яшчэ жыллё не плануецца...*

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Конкурсный управляющий
**КДУП «Сморгонский завод пищевых продуктов» – УП «ДжиЭс плюс» (www.gsplus.by) – извещает о проведении 31.05.2011 г. в 12 ч. 00 мин. по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6/3, оф. 2304 повторных торгов в форме аукциона (на повышение начальной цены) по продаже имущества:**

Лот № 1: Здание склада готовой продукции сушильного цеха – 396 кв. м, Здание пристройки к сушильному цеху с навесом – 305 кв. м, Здание гаража для машин – 314 кв. м, Административное здание – 504 кв. м, Здание теплицы – 262 кв. м, Здание кузницы – 11 кв. м, Капитальное строение с инвентарным номером 443/С-1254 –- 3760 кв. м, Здание котельной – 792 кв. м, Здание весовой 10 тонн – 55 кв. м, Навес для хранения сырья – 388 кв. м, Здание квасильно-засолочного пункта – 824 кв. м, Здание квасильно-засолочного пункта – 328 кв. м, Здание склада, карамельного цеха, сокового цеха – 1082 кв. м, Здание весовой 25 тонн – 109 кв. м, Здание насосной гидротранспортных вод – 30 кв. м, Здание насосной второго подъема – 194 кв. м, Здание канализационной насосной станции – 124 кв. м, Здание картофелехранилища № 5 – 2608 кв. м, Здание цеха сухого картофельного пюре – 4113 кв. м, Здание пожарного депо – 265 кв. м, Емкость № 1, Емкость № 2, Емкость № 3, Емкость № 4, Емкость № 5, Здание склада ГСМ № 2 – 41 кв. м, Здание установки для мазутоснабжения – 82 кв. м, Здание мазутонасосной – 24 кв. м, Отстойник гидротранспортных вод – 2663 кв. м, Очистные сооружения дождевых вод – 139 кв. м, Пожарный резервуар № 1, Пожарный резервуар № 2, Покрытия, Приемник картофеля, Приемник картофеля № 2, Резервуары с фильтром, Канализационная сеть, Линии электропередач, Тепловые сети, Водопроводная сеть, Мазутопровод, Зеленые насаждения (плодоносящие яблони), Ограждения.

Начальная цена лота составляет 2 089 320 000 рублей. Задаток составляет 104 466 000 рублей. Шаг торгов составляет 104 466 000 рублей.

Всё недвижимое имущество общей площадью около 22 000 метров квадратных расположено в Гродненской обл., Сморгонский р-н, д. Солы, ул. Социалистическая, 54 на территории общей площадью 14 га. Через территорию проходит действующий участок железной дороги. Имеется электричество, водоснабжение и газовое отопление практически всех зданий.

В сети Интернет план застройки территории завода имеющихся сетей, иной информации можно найти на http://gsplus.by/blocks/posts/130/

Прием заявок происходит по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6/3, оф. 2304 с даты настоящей публикации до 30.05.2011 г. с 9.00 до 18.00, здесь же ознакомление с составом лота и др. сведениями, формой заявки, договоров и др. документов. Тел. в г. Минске: 8(017) 204 68 70. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации до 30.05.2011 г. на р/с КДУП «Сморгонский завод пищевых продуктов» № 3012205980013 в ОАО «Белагропромбанк» отд. в г. Сморгонь, код 460, УНП 590340550.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения имущества по сравнению с предложениями других участников. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Способ уведомления участников об итогах торгов: в день торгов, публично.

В случае заявки одного участника на аукцион ему будет предложено приобрести выставляемый лот по начальной цене плюс 5 (пять) процентов.

# БОЛЬШ ЧЫМ ТУРЫЗМ

КРАЙ раскрытых душ і дзвярэй
КОНКУРС «ЛЕПШАЯ СЯДЗІБА ГОДА»

**Вясковы турызм можа і павінен быць розным. Сёлетні конкурс «Лепшая сядзіба года» добра гэта прадэманстраваў. Не толькі ў тым сэнсе, што ён можа задаволіць самыя розныя патрэбы: сямейны адпачынак, моладзевы, карпаратыўны... У Беларусі з'явіліся сядзібы, гаспадары якіх размахнуліся на важкія культурныя і сацыяльныя праекты. Напрыклад, Уладзімір Быхаўцаў, гаспадар сядзібы «Міколаў востраў» у Светлагорскім раёне, выратаваў ад гібелі помнік архітэктуры, Уладзімір Фабішэўскі, гаспадар «Дубое над Пінай» у Пінскім раёне прыцягнуў увагу грамадскасці і ўладаў да сядзібна-паркавага комплексу канца XV стагоддзя, а Ігар Ісаеў, гаспадар «Сядзібы» ў Магілёўскім раёне займаецца рэабілітацыяй падлеткаў, якія апынуліся ў складаным сацыяльным становішчы. Разам з тым у нас з'явіліся, нарэшце, сапраўды даступныя сядзібы ў вельмі прыгожых мясцінах. Туды можна ехаць адпачываць сем'ямі, загараць і купацца, гуляць па наваколлі і назіраць за вясковым жыццём.**

**«Звязда» ўжо публікавала рэпартажы з наведвання ў якасці журы конкурсу «Лепшая аграэкасядзіба 2010 года» трох абласцей: Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай (7, 9, 16, 19 красавіка). 15 красавіка на Другой міжнароднай канферэнцыі «Аграэкатурызм — стан і перспектывы развіцця», якую арганізоўваў Белаграпрамбанк, былі названы сядзібы-пераможцы. Але засталіся яшчэ тры вобласці, пра якія трэба расказаць, тым больш што туды адправілася нямала хрустальных пеўняў, якія ўручаюцца толькі лепшым у мінулым годзе.**

## ДАДАТКОВЫ БІЗНЭС

Сярод гаспадароў аграсядзіб нямала гараджан, якія набылі або пабудавалі дом у вёсцы, з цягам часу прыстасавалі яго для прыёму турыстаў і жывуць з гэтага або атрымліваюць дадатковы даход. За апошнія два-тры гады з'явілася цэлая праслойка новых гаспадароў, якія сталі займацца гэтай справай, даведаўшыся аб прэферэнцыях, якія гарантуе дзяржава. Лілія Ярмолава, гаспадыня сядзібы **«Мілы сэрцу кут»** у Гомельскім раёне — адна з такіх.

Спачатку яна купіла старую хату ў пасёлку Красным пад Гомелем для сябе. Рэканструявала яе, пабудавала лазню, а потым зразумела, што на гэтым можна зарабляць. Яна зарэгістравалася ў падатковай інспекцыі як суб'ект агратурызму, размясціла аб'яву ў СМІ, а пазней купіла ў гэтай жа вёсцы... яшчэ тры дамы! На жаль, саму гаспадыню мы не бачылі, нас сустракаў чалавек, які патлумачыў, што Лілію «не адпусціў» другі бізнэс. Аднак размах нас уразіў. Пасутнасці, тут задуманы цэлы гасцявы комплекс з развітай інфраструктурай: некалькі гасцявых дамкоў, альтанкі, вялікі вясельны стол, лазні, дзіцячыя пляцоўкі...

Самае моцнае ўражанне мы зведалі, як толькі выйшлі з аўтамабіля. Пасля чатырох гадзін няпростай дарогі раптам аказаліся ў незвычайным месцы. Вёску не бачылі, бо дом, які ўжо гатовы для турыстаў, першы і самы крайні. А перад ім — вялікая прастора, абкружаная лесам. Тут ціха, светла і адасоблена ад усяго свету з яго гонкай і мітуснёй. Адразу захацелася застацца.

У пейзаж нібы з фільма «Люстэрка» Таркоўскага ўносіла дысгармонію толькі агароджа з... калючага дроту. Ды краты на вокнах не вязаліся з уяўленнем адпачынку на прыродзе. Напэўна, гэта плата за немагчымасць гаспадароў пражываць тут пастаянна і адсутнасць суседзяў, якія маглі б за домам і тэрыторыяй прыглядзець.

— Калі сельскім турызмам займацца сур'ёзна, на хлеб з маслам зарабіць можна, — сказаў чалавек, які нас сустрэў. — Праўда, каб развівацца, у сядзібу трэба увесь час укладаць, і мы пакуль не кідаем другі бізнэс, які дазваляе фінансаваць гэты і трымае нас у горадзе.

Сядзіба карыстаецца попытам: месца прыгожае і чыстае, у чым я ўпэўнілася, пaглядзеўшы на карту радыяцыйнага забруджання, да таго ж Гомель і Чарнігаў побач. Падобна, што людзі сюды прыязджаюць з задавальненнем і многія знаходзяць тое, што шукалі, але гэта — не вясковы турызм у чыстым выглядзе. Хутчэй папулярны ў нас, дзякуючы сваёй рэнтабельнасці, гібрыд арэнды катэджа і вясковага дома.

У такіх сядзіб ёсць свая асаблівасць. Быццам бы ўсё добра: цікавы дом, светлыя пакоі, альтанка, маляўнічы дагляд, стары сад, лес, не надта далёка возера... Але нечага не хапае. Магчыма, адчування прысутнасці гаспадароў. Не фізічнай іх прысутнасці побач з гасцямі, а адбітку асобы ў рэчах, двары, інтэр'еры. Не хапае адухоўленасці жытла. Таго водару, які адрознівае дом ад любога арэнданага жылля. Але гэта — маё асабістае ўражанне, і па-першае, не для кожнага турыста адчуванне абжытага месца мае значэнне, а па-другое, само гэтае адчуванне — надта суб'ектыўная рэч. Напрыклад, доктар архітэктуры, прафесар Сяргей Сергачоў заўважыў у сядзібе «Мілы сэрцу кут» досыць важных пераваг і добрыя перспектывы.

— Тут закладзены вельмі добры пачатак, — патлумачыў ён. — І зроблены правільны ход. Сядзіба ўжо працуе, і паступова выкупляюцца дадатковыя дамы. Фарміруецца цэнтр адпачынку, і ствараецца інфраструктура. Людзі, якія прыедуць сюды, змогуць пабыць паасобку, адпачыць і потым сабрацца разам. У перспектыве будзе вельмі хораша. Дарэчы, тут я ўпершыню ўбачыў незвычайнае архітэктурнае рашэнне: спалучэння дрэва і каменю. Гэта — удалы прыклад рэкрэацыйнай архітэктуры, і падобна, што гаспадары самі яго вынайшлі. Дом набыў непаўторнае і запамінальнае аблічча. Мне спадабаўся ён і знутры: частка столі разабраная, а з гарышча зроблены паўпаверхі. Такога дакладна не сустракаў. З'явіліся дадатковае святло і прастора. Балкончык, печка, лесвіца — усё цудоўна звязана паміж сабой. Атрымалася здорава!


Сядзіба «Мілы сэрцу кут». Дзякуючы агратурызму ў вёсцы з'яўляецца новая архітэктура — рэкрэацыйная.



Такія ўказальнікі пакуль можна сустрэць толькі ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях.

Сядзіба «Мілы сэрцу кут» перамагла ў абласным конкурсе ў намінацыі «Стыль і гармонія». Журы рэспубліканскага конкурсу вырашыла, што пакуль да галоўных прызоў сядзіба яшчэ не дарасла, але ў недалёкай будучыні такое цалкам рэальна.

У інтэрв'ю газеце «Деловой Гомель» Лілія Ярмолава сказала, што ўклала ў «Мілы сэрцу кут» ужо каля 70 тысяч долараў. Але пра вяртанне грошай казаць пакуль рана. На працягу месяца вясковы дом заняты турыстамі 7-10 дзён. Гэтага мала. Па інфармацыі ў інтэрнэце, арэнда доміка на 6 чалавек (без асаблівага камфорту тут можна пакласці спаць і 12 гасцей) каштуе 60 еўра ў суткі, лазні — 30 еўра ў суткі, вечарынка без начлегу — 25 000 беларускіх рублёў з госця. Напэўна, ёсць варыянты, бо чалавек, які нас сустракаў, казаў пра 40 тысяч беларускіх рублёў з кожнага за начоўку і карыстанне лазняй. Гэта — без харчавання. Палова атрыманай выручкі, па словах гаспадыні, ідзе на ўтрыманне турыстаў: вываз смецця, добраўпарадкаванне тэрыторыі і дома, плата за электрычнасць і дровы, замена пабітага посуду... Лілія Ярмолава лічыць, што для таго, каб сядзіба пачала прыносіць прыбытак, які дазволіць развівацца без дапамогі дадатковага бізнэсу, яна павінна быць занятая тры тыдні ў месяц. «Аграэкатурызм, — мяркуе гаспадыня, — гэта праект з вялікімі тэрмінамі акупнасці».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
***(Працяг будзе.)***

## НАМ «МАЗДУ» НЕ ТРЭБА, НАМ «ВАЗА» ДАВАЙ

Тры аўтамабілі «ВАЗ 2105» на працягу адной гадзіны зрабілі спробу сагнаць двое маладых гамяльчан. Магчыма, злачынцаў спакусіла адсутнасць у іх сігналізацыі. На першай машыне, аднак, хутка заклініла руль і зламыснікі заехалі ў дрэва. У другой хлопцы разбілі шкло, але так і не змаглі яе завесці. Калі заняліся трэцяй — былі засцігнутыя супрацоўнікамі ДАІ. Як расказаў намеснік начальніка ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі УУС Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Баскакаў, убачыўшы міліцыянераў, маладыя людзі паспрабавалі схавацца, але былі затрыманы.

## САЛЯРКА РАСТВАРЫЛАСЯ

Амаль 700 літраў дызельнага паліва невядомым чынам знікла з ахоўнай тэрыторыі склада ГЗМ на мехдвары КСУП «Людзяневічы» ў вёсцы Ленін Жыткавіцкага раёна. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, ёсць меркаванне, што невядомы зрабіў адтуліну ў паліваправодзе ёмістасці для захоўвання саляркі, і на працягу трох папярэдніх тыдняў «адсмактаў» гаручую вадкасць на суму больш за Br1,5 млн.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## КАНТРАБАНДНЫЯ ПАНЧОХІ...

Каля в. Барысава (Кобрынскі раён) супрацоўнікі міліцыі сумесна з работнікамі Камітэта дзяржкантролю і памежнікамі праверылі а/м «Тайоту-Пікнік», якой кіравала 39-гадовая жыхарка Гродна.

Жанчына перавозіла 13 баулаў з калготкамі і панчохамі і 48 упаковак шкарпэтак без дакументаў на іх.

Канфіскаваны тавар пацягнуў на 30 млн рублёў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ЗГАРЭЛА СЕЛЬСКАЯ КРАМА

28 красавіка а 4-й гадзіне загарэлася крама ў вёсцы Пятровічы Бабруйскага раёна. Выратавальнікі МНС прыбылі на месца, калі аднапавярховы будынак з бярвення адкрыта гарэў. Крама, на жаль, не была абсталявана аўтаматычнай пажарнай сігналізацыяй.

Як паведаміла прэс-служба Магілёўскага УМНС, агонь знішчыў склад, харчовыя і прамысловыя тавары, абсталяванне крамы, дах і перакрыцці будынка. Абрынулася частка сцяны прыбудовы. Але прычына пажару пакуль невядомая, яна высвятляецца.

**Ілона ІВАНОВА.**

# Святая зямля

Бясeдныя ПЕСНІ

**Святочная атмасфера ўсталёўваецца на канцэртах ансамбля народнай музыкі «Бяседа». Лірычныя песні змяняюцца жартоўнымі, велічна гучаць урачыстыя творы. У зале робіцца так радасна-ўтульна, як на сапраўднай бяседзе. А на ёй заўсёды імкнуцца наладзіць паразуменне. І не толькі між супольнікамі, але і з усёй грамадой, з наваколлем.**

Гадоў дзесяць таму ў рэпертуар «Бяседы» ўвайшла песня-прызнанне «Святая зямля» Леаніда Захлеўнага і Леаніда Пранчака. Гэты твор — прысвячэнне нашаму маляўнічаму краю, мужнай краіне, дзе ў стваральнай працы выкрышталізоўваецца чысціня памкненняў, а ў бязлітасных дзеях-пажарышчах загартоўваецца святая вера людзей у справядлівасць, у прасветлую любоў.

### СВЯТАЯ ЗЯМЛЯ

**Верш Леаніда Пранчака**
**Музыка Леаніда Захлеўнага**

*На ранішнім небе пунсовае сонца,*
*Іскрацца праменні на мокрым лісці.*
*Над люстрам азёр да сонца і зор*
*Ляці, мая песня, ляці.*
*Каханне і радасць душы — азарэнне,*
*Ласкавыя словы мае нездарма.*
*Таму што люблю я гэту зямлю**
*І веру, што лепшай няма.*

*Самотная кнігаўка плача над лугам*
*Густой збажынoю красуюць палі.*
*Світальнай парой сваёй дабрынёй*
*Ты сэрца маё наталі.*
*Застанься навекі святою і чыстай*
*У вэлюме дзіўных рамонкаў і руж,*
*Любові зямля, Радзіма мая,**
*Пяшчотная Белая Русь.*

*Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**



Дыскусійная трыбуна

# Каб сплаціць грошы ў дзяржаўны бюджэт, трэба вытрапаць нервы?

**Яшчэ месяц таму беларускі аўтарынак віраваў. Пісалі, што на мяжы — сутачныя чэргі на размытнёўку. Людзі рвуць жылы, каб выкарыстаць апошні шанц на набыццё машыны перад 1 ліпеня.**

Але ў красавіку рынак з-за непаразуменняў з валютай нібыта прыцішыўся.

Скарыстаўшыся гэтым, еду ў Літву забіраць машыну для сваёй сястры. Мая задача — перагнаць «Сітраэн» праз мяжу і прывезці дадому. Выбіралі машынку знаёмыя перагоншчыкі.

Але інфармацыя пра тое, што «рынак лёг і чэргаў няма» аказваецца глупствам. На пункце пропуску «Медзінінкай—Каменны лог» бачу чаргу з аўтамабіляў, на якіх транзітныя нумары. Штук 300. Звар'яцець.

Па парадзе знаёмых ад'язджаю ад Меднікаў кіламетраў на 50 і прыбываю на іншы пункт пропуску.

*«Ніводнай машыны, фантастыка»*, — паркуюся я на літоўскай мытні і нясу стос рознакаляровых дакументаў да замежнага мытніка.

Напэўна, кожны перагоншчык, хто чытае гэтыя радкі, зараз усміхнецца, пазнаўшы знаёмую карцінку.

Службовая асоба зазірае ў мой пашпарт, насупліваецца і пачынае аглядаць каляровыя паперкі:

*—Тут напісана «без нумароў», ваша машына павінна ехаць на лафеце, — нечакана ўпёрся рогам мытнік. — Магу выпісаць штраф у 300 літ. Прыдумайце нешта...*

— *Што прыдумаць?* — збянтэжваюся я, як баран аглядаючы літоўскія дакументы, у якіх мне нічога не зразумела. — *Усе паперы павінны быць у парадку, імі займаліся дасведчаныя людзі, перагоншчыкі.*

*— Начуйце тут, калі вы такі тугадум....*

Тэлефаную перагоншчыкам, якія складалі дакументы, распавядаю аб праблеме.

*— Мы ж табе казалі пакласці ў пашпарт 10 літаў* (каля 4 долараў. — **аўт.**).

— Дык гэта ж хабар, за с... возьмуць...

*— Не возьмуць. 10 літаў — гэта негалоснае правіла. А не дасі, дык і праўда штраф упаяе. Сам не зразумееш, за што. Я аднойчы ўпіраўся, дык ледзь не выпісалі 100 долараў, у выніку даў дваццатку, каб адчапіліся...*

Куды скардзіцца ў чужой краіне, я не ведаю, дзесяці літаў не маю. Тое, што памяняў, аддаў за запраўку. Кладу ў пашпарт 10 долараў, як падказаў перагоншчык, і іду да таго ж самага мытніка: «Дакументы выпраўлены».

Той спрактыкаваным рухам кідае банкноту ў кішэню мундзіра, робіць усе неабходныя пазнакі і адпускае мяне на ўсе чатыры бакі. З інтанацыяй старэйшага брата зычыць удачы.

Пакідаючы бокс літоўскага мытніка, заўважаю, што на аконцы вісіць постар «Не — карупцыі» з нумарамі тэлефонаў. Але мне трэба перагнаць машыну і не хочацца начаваць на літоўскай мяжы. Невядома яшчэ, што ўбачаць у дакументах антыкарупцыянеры.

Распавядаю пра дзівосы на мытні расіянам, тыя ўсміхаюцца, але дзеля справядлівасці дадаюць:

*— Гэта толькі на мытні. Мы чулі, калі літоўскім памежнікам сунеш грошы, могуць тут жа скруціць ласты, без лішніх размоў...*

Як бы там ні было, літоўскую мяжу я прайшоў, далібог, са свістам — за 20 хвілін. Наступнае выпрабаванне чакае мяне на беларускай мяжы.

Перада мной не 300, а ўсяго дзевяць машын на размытнёўку. Кожны з гэтых людзей (прафесійны перагоншчык гэта ці звычайны грамадзянін) хоча як мага хутчэй аддаць у дзяржбюджэт свае 400, 500, 800, 2000 еўра мыта і паехаць дадому высыпацца.

Уначы нечакана прымарозіла, многія людзі ў лёгкіх куртачках і летніх красоўках. Праходзіць гадзіна, другая — а пункт афармлення ўсё не працуе. Спрактыкаваныя перагоншчыкі маўчаць, а такія, як я, пачынаюць мацюкацца, клясці і ненавідзець гэтых пасрэднікаў паміж намі і дзяржбюджэтам.

Толькі гадзіны праз дзве з паловай чарга пачынае рухацца, вельмі павольна. Такое ўражанне, што ў капцёрцы, дзе афармляюць размытнёўку на аўто, вырашаюць зусім іншыя — геапалітычныя пытанні: ці будзем штурмаваць склады зброі ў Антарктыдзе.

Удзельнікі чаргі спрабуюць грэцца ва ўжо халодных машынах. Самыя шчаслівыя стаяць у празрыстых сенцах капцёркі, дзе афармляюцца дакументы на размытнёўку, і ціха «жадаюць здароўя» мытнікам за іх «спрытнасць».

Чарга дайшла да мяне. Ужо развіднела.

Мытніца ў цэлым аказалася прыемнай жанчынай: адказнай, цікаўнай, трошкі беларускамоўнай. Старанна дапамагала аформіць дэкларацыю, якую я, неспрактыкаваны, здолеў правільна напісаць толькі з чацвёртага разу. Жанчына па-мацярынску дапамагала з дакументамі, каб я, недарэка, не нарабіў памылак і не атрымаў праблем.

Мытніца патлумачыла, што чарга сунецца так доўга з-за непаваротлівасці такіх «перагоншчыкаў», як я, якія з эннага разу запаўняюць простую дэкларацыю...

На выездзе з мытні я паглядзеў у талон: аказалася, што прастаяў тут пяць гадзін — з паловы на трэцюю ночы да паловы на восьмую раніцы.

І гэта з чаргой у дзевяць машын. Падумаў: чаму ў такой мізэрнай чарзе я павінен быў чакаць столькі, каб перадаць у бюджэт 800 еўра?

*«Не можаце аператыўна афармляць размытнёўку, пасадзіце дадатковых людзей»*, — абураўся я сам сабе. Яшчэ б! Для таго, каб пакласці ў дзяржбюджэт 800 еўра, давялося вытрапаць нервы.

Грэшнай справай у чарговы раз падумаў пра тое, што «варыянт тугадума» на суседняй мяжы куды больш прывабны і эканоміць высілкі.

*— Але ў нас хабараў вось так проста ўжо не бяруць,* — з гонарам распавядаў мне адзін з супрацоўнікаў пункта пропуску, якога я падвозіў у яго родны Астравец. *— Была крымінальная справа, у нас тут 45 чалавек пасадзілі. А дзяўчаты раней афармлялі па дзве-тры машыны на дзень, а зараз злуюцца з-за гэтага наплыву. Паспрабуй столькі дакументаў аформіць!*

Не паспрачаешся. І ўвогуле, не раз сутыкаўся, што на кожны аргумент супрацоўнік любога ведамства знойдзе контраргумент. А вынік усё адно адзін — чэргі, знявагі і праклёны. Ці правільна гэта? Няўжо гэтага нельга пазбегнуць?

Днямі чытаў слушныя артыкулы газеты «Аўтабізнэс» пра іх досвед прыгону машын з-за мяжы. Дык павесяліўся ад таго, як у нас з аўтарамі супалі ўражанні. Той жа лейтматыў — чаканне і непаваротлівасць пэўных прадстаўнікоў ведамаснай машыны. Толькі там чарга была з шасці аўтамабіляў, а чаканне — чатыры гадзіны.

Чалавеку з пачуццём гонару складана абыякава пагадзіцца з такімі «паслугамі». Адчуваеш сябе афрыканскім эмігрантам, які незаконна ўцякае на лодцы ў Італію і спрабуе атрымаць від на жыхарства.




Але я не бежанец, я хацеў законна перасекчы мяжу і зрабіць размытнёўку, паклаўшы ў бюджэт сваёй краіны 800 еўра.

Лічыцца, што па тым, як службовыя асобы (менавіта службовыя: яны павінны служыць звычайным грамадзянам, бо атрымліваюць заробкі з іх падаткаў) ставяцца да людзей, у многім вымяраецца цывілізаванасць грамадства. Мытнік, памежнік, міліцыянт, пажарнік — гэта не толькі чалавек у пагонах, прадстаўнік улады. Гэта абслуговы персанал народа. Толькі многія гэтага не разумеюць, уяўляючы, што, напрыклад, гумовы дручок у руках — гэта царскі скіпетр.

Ёсць відавочныя зрухі ў лепшы бок. Але тое зняважлівае савецкасацыялістычнае стаўленне да простага смяротнага з боку «асобы ў форме» дагэтуль цалкам не выкаранілася. Вось вам і індыкатар цывілізаванасці. Хоць, напэўна, і процілеглы бок, г.зн. мы з вамі, таксама не заўсёды паводзіць сябе бездакорна.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

# КУЛЬТУРНЫ БУМ накрые Беларусь да 2015 года

**У нашай краіне ўпершыню распрацавана дзяржаўная праграма «Культура» на бліжэйшыя пяць гадоў. Адлік ідзе. Але бывае так, калі можна недалічыцца чагосьці, калі пачаць надта шпарка ўсё мяняць. А калі мяняць не ўсё, не адразу, а можа, і наогул не мяняць? З такімі пытаннямі я накіравалася ў Міністэрства культуры Беларусі, каб намеснік міністра Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ патлумачыў найбольш відавочныя адрозненні ад папярэдніх падыходаў у працы ведамства. Усё-такі як ні круці — бюджэтная сфера, з нашых кішэняў (чытай — падаткаў) фінансуецца. Значыць, кожны наш грамадзянін (чытач) мае права ведаць, што і як збіраецца рабіць дзяржава дзеля яго ж.**

**— У нас у грамадстве тэма культуры часта ўспрымаецца як нешта забаўляльнае і неабавязковае. Мабыць з-за гэтага пэўная частка людзей не можа знайсці сябе, пускаецца ў непрыемнасці, нясе іх іншым. Юнак, які захапляецца чытаннем кніг, наўрад ці пойдзе хуліганіць і так далей. Як многім людзям патлумачыць, дзе іх чакаюць?**

— Калі культура будзе ўспрымацца не як галіна, а як стан развіцця грамадства, тады і роля, і ацэнка будуць іншыя. Нездарма адна з задач дзяржаўнай праграмы — стварэнне роўных умоў і магчымасцяў для карыстання здабыткамі культуры. Для гэтага павінна быць сетка разнастайных устаноў культуры, прафесійных калектываў. Для гэтага павінна быць сфарміравана заканадаўчая і нарматыўная база. Цэлы комплекс мер, які ператварае вузкаведамасную праблему ў агульнадзяржаўную. Задача дзяржаўнай праграмы і ёсць у тым, каб падрыхтаваць ці спрыяць таму, каб праблемы культуры ўспрымаліся грамадствам як найважнейшыя, ад якіх залежыць лёс краіны.

Мы гаворым, што сёння культура з'яўляецца гарантам і нацыянальнай бяспекі. Таму што дзякуючы культуры захоўваецца нацыянальная самабытнасць, традыцыі, нацыянальная мова. Калі ў такім сэнсе разглядаць гэтую праблему, можна больш дакладна, больш граматна расстаўляць акцэнты. Тады і ролю культуры можна больш адэкватна ацэньваць. Культура не дае аддачы імгненнай. Гэта інвестыцыі ў будучыню — чалавека і краіны.

**— Тады патлумачце, чым прынятая Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2011—2015 гады адрозніваецца ад галіновай праграмы захавання і развіцця культуры Рэспублікі Беларусь, якая дзейнічала дагэтуль?**

— Такая праграма ў сферы культуры ўпершыню прынята на дзяржаўным узроўні, на патрэбы культуры запланавана выдзяленне значна больш бюджэтных сродкаў. Па-другое, гэтая праграма больш аб'ёмная па змесце, мае іншую структуру, у ёй закрануты шырэйшы спектр праблем, якія неабходна вырашаць у бліжэйшай перспектыве. Па-трэцяе, акрамя традыцыйных відаў дзейнасці, у праграме плануецца шмат інавацыйных падыходаў і мерапрыемстваў.

Напрыклад, у сувязі з аб'ектыўнай камерцыялізацыяй дзейнасці ўстаноў культуры, вельмі актуальным з'яўляецца пошук дадатковых крыніц фінансавання, у тым ліку і за кошт развіцця платных паслуг. Менавіта таму ў ДП запланавана правесці структурныя пераўтварэнні арганізацыйна-гаспадарчага механізма галіны, распрацаваць эфектыўны механізм фінансавання культуры, новыя формы яе эканамічнай падтрымкі, прадоўжыць работу па стварэнні цывілізаванага рынку паслуг. У праграму ўключаны мерапрыемствы па прыцягненні дадатковых пазабюджэтных інвестыцый у сферу культуры, адаптацыі сферы культуры да функцыянавання ва ўмовах рыначнай эканомікі.

Упершыню ў праграме многа ўвагі надаецца культурнаму складніку ў іміджавых камунікацыях дзяржавы, эфектыўным пазіцыянаванні краіны на замежныя аўдыторыі, выкарыстанню патэнцыялу беларускай культуры для фарміравання і ўмацавання станоўчага міжнароднага іміджу Рэспублікі Беларусь. Пазітыўная рэпутацыя Беларусі ў свеце як краіны з высокім узроўнем развіцця ўсіх форм самабытнай традыцыйнай і сучаснай культуры будзе садзейнічаць станаўленню аўтарытэту дзяржавы, станоўча паўплывае на інвестыцыйны клімат, развіццё міжнароднага турызму, міграцыйныя працэсы і іншае.

Шмат увагі ў праграме нададзена мерапрыемствам, накіраваным на ўдасканаленне сеткі арганізацый культуры і ўмацаванне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы. Плануецца адкрыццё новых музейных устаноў, Дамоў народнай творчасці і Цэнтраў фальклору, кінатэатраў, а таксама капітальны рамонт і рэканструкцыя будынкаў дзейных арганізацый культуры.

Культура — гэта жывы арганізм, і ён патрабуе новых захадаў, як па вырашэнні сённяшніх праблем, так і новых падыходаў да развіцця сферы культуры.

**— Які механізм фінансавання культуры плануе цяперашняя праграма?**

— У выніку рэалізацыі задач і дасягнення паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы ўзрасце сацыяльная і эканамічная эфектыўнасць функцыянавання галіны культуры за кошт рацыянальнага і эфектыўнага выкарыстання дзяржаўных рэсурсаў, прыцягнення дадатковых пазабюджэтных інвестыцый у сферу культуры, развіцця пазабюджэтнай камерцыйнай дзейнасці, адаптацыі сферы культуры да функцыянавання ва ўмовах рыначнай эканомікі.

Для рэалізацыі мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» запланаваны на 2011-2015 гады сродкі ў памеры 1 144,7 млрд рублёў, у тым ліку рэспубліканскі бюджэт — 447,4 млрд рублёў, мясцовыя бюджэты — 691,8 млрд рублёў, пазабюджэтныя сродкі — 5,5 млрд рублёў.

Сёлета плануецца накіраваць на выкананне гэтай праграмы 200,5 млрд рублёў, з якіх рэспубліканскі бюджэт складае 54,8 млрд рублёў, мясцовыя бюджэты — 144 млрд рублёў, іншыя крыніцы фінансавання — 1,7 млрд рублёў.

Рэалізацыя мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы дазволіць стварыць перадумовы, умовы і дзяржаўныя гарантыі для духоўнага ўдасканальвання грамадства ў адпаведнасці з агульначалавечымі каштоўнасцямі і традыцыйнымі каштоўнасцямі народаў Рэспублікі Беларусь. Ажыццяўленне праграмы павінна забяспечыць максімальную даступнасць культурных даброт і адукацыі ў сферы культуры, пераадолець дыспрапорцыі, выкліканыя розным ступенню забеспячэння насельніцтва паслугамі сферы культуры ў гарадской і сельскай мясцовасці.

**— Якія інавацыйныя падыходы ў сферы культуры будуць прымяняцца ў бліжэйшай пяцігодцы?**

— Галоўны акцэнт у Дзяржаўнай праграме зроблены на інавацыйныя падыходы. Асноўныя задача — стварэнне сістэмы нацыянальных прэферэнцый для культуры краіны. Праграма накіравана на стымуляванне паступленняў пазабюджэтных сродкаў у сферу культуры (правядзенне рэспубліканскага конкурсу «Мецэнат культуры», стварэнне апякунскіх саветаў пры нацыянальных і найбольш значных установах культуры, інфармацыйная падтрымка мецэнацкай дзейнасці ў СМІ). Гэта і правядзенне рэстаўрацыйных работ з выкарыстаннем розных крыніц фінансавання на найбольш знакавых аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі (Лідскі замак, Гальшанскі замак, Навагрудскі замак). Дзяржава зацікаўлена ў стварэнні Нацыянальнай электроннай бібліятэкі, у стварэнні новых рэсурсаў, — такіх, як электронная бібліятэка «Францыск Скарына - беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар» і электронная бібліятэка «Radziviliana». Укараненне інавацыйных тэхналогій у сферу культуры — поўная камп'ютарызацыя дзяржаўных музеяў і бібліятэк, стварэнне электронных і Інтэрнэт-рэсурсаў па культуры. Плануецца стварэнне прынцыпова новых канцэпцый Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Нацыянальнага гістарычнага музея. Акрамя таго, ёсць патрэба ў Нацыянальным інтэрнэт-партале «Музеі Беларусі». І што асабліва важна — стварэнне Рэспубліканскага цэнтра рэстаўрацыі і кансервацыі.

**— Асобная ўвага праграмы — развіццю айчыннага кінематографа. Якім чынам плануецца яго развіваць?**

— Кіно сёння з'яўляецца самым даступным для насельніцтва відам мастацтва і эфектыўным інструментам мэтанакіраванага ўздзеяння на аўдыторыю гледачоў. Нездарма гэтаму віду мастацтва надаецца такая ўвага на ўзроўні кіраўніцтва краіны. Міністэрствам культуры распрацавана ўзгодненая з зацікаўленымі органамі дзяржаўнага кіравання сістэма прыярытэтаў пры фарміраванні дзяржаўнага сацыяльна-творчага заказу на вытворчасць фільмаў на конкурснай аснове. Дзеля павышэння канкурэнтаздольнасці і акупнасці фільмаў абавязковым складнікам кожнага кінапраекта стала наяўнасць бізнэс-праграмы. Выключнае значэнне ў павышэнні акупнасці вытворчасці фільмапрадукцыі мае супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі. Павышаны патрабаванні да маркетынгавай палітыкі, эфектыўнасці рэкламных кампаній, узроўню правядзення кінамерапрыемстваў (у т. л. міжнародных), укаранення новых формаў інфармацыйна-рэкламнай працы. Працягваецца поўнамаштабная тэхнічная мадэрнізацыя вытворчай базы кінастудыі.

У адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай, да 2015 года плануецца правесці капітальныя рамонты будынкаў кінатэатраў, іншых месцаў паказу і фільмабаз, мадэрнізаваць усе кінатэатры рэспублікі ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі, удасканаліць кінапраекцыйнае і гукавое абсталяванне кінатэатраў, абсталяваць іх сістэмамі аб'ёмнага гучання «Dolby Digital», абсталяваннем для лічбавага кінапаказу. Акрамя таго, плануецца пабудаваць шэраг новых сучасных кінатэатраў.

Важнай задачай на бліжэйшы час з'яўляецца стварэнне роўных умоў для гарадскіх і сельскіх жыхароў у доступе да паслуг культуры. Для гэтага неабходна набываць відэапраекцыйныя сістэмы і аўтамабілі для кінаабслугоўвання жыхароў аграгарадкоў і аддаленых сельскіх населеных пунктаў. У 2011—2015 гадах для патрэб рэгіёнаў плануецца набыць 795 відэапраекцыйных сістэм і 161 аўтамабіль.

**— Якім чынам будзе ўмацоўвацца імідж нацыянальнай культуры за мяжой?**

— Культура Беларусі, як адна са старажытных славянскіх культур, на фоне агульнага культурнага ландшафту можа разглядацца як унікальная па ступені захаванасці сваіх аўтэнтычных формаў, спадчыны этнічнай культуры, песенна-музычнага фальклору, традыцыйных рамёстваў, шматжанравага прафесійнага мастацтва, індывідуальнай і калектыўнай мастацкай творчасці. Гэта дае нам сёння падставы ладзіць цесныя кантакты ва ўсіх галінах культурнага жыцця як з краінамі-суседзямі, так і з сусветным супольніцтвам у цэлым, весці з імі ўзаемазацікаўлены дыялог.

Чакаецца, што сёлета ў Беларусі пройдуць Дні культуры Венгрыі, Ірана, Катара, Кітая, Літвы, Украіны, будзе прадстаўлена польская культура ў рамках старшынства Польшчы ў Савеце Еўрапейскага саюза.

Праграмай прадугледжана рэалізацыя праекта «Беларусь сёння», распачатага летась Міністэрствам культуры разам з Міністэрствам інфармацыі і Міністэрствам замежных спраў. У межах праекта плануецца штогод перадаваць у фонды пяці буйнейшых бібліятэк свету каля 100 лепшых кніг айчынных выдавецтваў — камплект выданняў, які будзе ўсебакова адлюстроўваць сацыяльна-эканамічнае і палітычнае жыццё нашай краіны, яе шматвяковую гісторыю і культуру, дапаможа ахвотным пазнаёміцца з жывапіснымі краявідамі Беларусі. Першай замежнай бібліятэкай у рэалізацыі праекта стала Бібліятэка Кангрэса ЗША. У будучым плануецца перадача камплектаў кніг нацыянальным бібліятэкам Расіі, Украіны, Польшчы, Германіі і іншым.

У Праграме знайшла сваё адлюстраванне арганізацыя за мяжой стажыровак рэжысёраў тэатраў і масавых мерапрыемстваў, дырыжораў, оперных спевакоў, мастакоў і іншых спецыялістаў творчых прафесій з мэтай вывучэння замежнага вопыту і наладжвання карыснага ўзаемадзеяння.

Знешняя культурная палітыка нашай дзяржавы, арыентаваная на ўзаемаўзбагачэнне культур і інтэграцыю краіны ў сусветную культурную прастору, забяспечвае ўсім зацікаўленым у гэтым партнёрам умовы для свабоднага доступу на сваю культурную прастору.

**Падрыхтавала Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Юбілеі

### СНАЙПЕР БЕЛАРУСКАГА КІНО

**АЛЯКСАНДР ЯФРЭМАЎ ЗРАБІЎ САБЕ ПАДАРУНАК**



**У ВЫГЛЯДЗЕ НОВАГА ФІЛЬМА**

Прэм'ера фільма «Немец» адбудзецца на сцэне Тэатра-студыі кінаакцёра падчас творчага вечара рэжысёра 4 мая. Але сваё 60-годдзе народны артыст Беларусі Аляксандр Яфрэмаў адсвяткуе 1 мая. Пашчасціць жа нарадзіцца ў свята працы — без працы не сядзець...

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в комиссию по проведению аукционов:

- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);
- заверенную копию платежного поручения о внесении задатка (10 % от начальной цены) на расчетный счет Сычковского сельисполкома № 3604712110312 в АСБ «Беларусбанк» филиал 703, код 760, УНН 700045734, код платежа 04901;
- представителем гражданина Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;
- при подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.

2.Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.

3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

Местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона принимает решение о передаче в частную собственность гражданину Республики Беларусь (победителю аукциона) земельного участка. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения победитель аукциона обязан внести плату за выкупленный в частную собственность земельный участок, возместить расходы, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

**11 мая 2011 года в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Промтовары-Пинск».**

**Повестка дня:**

1. Об изменении размера уставного фонда Общества.
2. О внесении и утверждении изменений в устав ОАО «Промтовары-Пинск».
3. О совершении сделок Обществом.

**Собрание будет проходить по адресу: г. Пинск, пл. Ленина, 4**.

Начало регистрации участников собрания – **11.00.**

УНП 200181862

## АДСВЯТКАВАЛІ...

**Сёлетняе свята Вялікадня, мабыць, надоўга запомніцца двум замежным грамадзянам, якіх затрымалі беларускія памежнікі.**

Паводле інфармацыі прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі, 19-гадовага грамадзяніна Літвы, жыхара Вільнюса, лідскія памежнікі затрымалі на адлегласці ў паўтара кіламетра ад беларуска-літоўскай мяжы. Малады чалавек накіроўваўся ў вёску Сурвілішкі Іўеўскага раёна па гарэлку, матывуючы тым, што яна ў нас таннейшая.

А вось 58-гадовага грамадзяніна Польшчы спынілі гродзенскія памежнікі. Напярэдадні ўвечары яны з сябрам святкавалі непадалёк ад мяжы, прычым у салоне аўтамабіля. Жыхар населенага пункта Стшэльцавізна прачнуўся адзін і без ключоў, пасля чаго пайшоў куды вочы глядзяць. Так і трапіў да беларускіх памежнікаў, якія даставілі яго ў ізалятар часовага ўтрымання.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Авенам трэба пазбягаць службовых раманаў, а Дзевам — кантраляваць эмоцыі

**АВЕН.** Дзелавыя адносіны, якія нядрэнна складваюцца, могуць нечакана перайсці ў іншую плоскасць. Сцеражыцеся службовых раманаў, таму што менавіта цяпер яны могуць на корані загубіць вашу кар'еру. Не выключаная магчымасць таго, што нейкую справу давядзецца пачынаць зноў. Пажадана перагледзець свой стыль паводзін, магчыма — змяніць імідж. Паспрабуйце паводзіць сябе адэкватна сітуацыі. Панядзелак — адзін з самых плённых дзён тыдня, калі можна зрабіць нашмат больш, чым запланавана.

**ЦЯЛЕЦ.** Поспех будзе спадарожнічаць: шматлікія справы, якія ўступілі ў фазу заканчэння, удала завершацца на вашу карысць. У панядзелак любыя кантакты будуць вельмі карыснымі. Аўторак, магчыма, паверне вас да гаспадарчых клопатаў, збольшага дакучлівых, але ўражлівых па выніках. Серада злёгку збянтэжыць летанінай па неадкладных справах і сумятлівымі паездкамі па горадзе і за яго межамі. У чацвер вашай слабасцю могуць скарыстацца. Выходныя дні ёсць шанц правесці ў нязвыклым, але камфортным становішчы.

**БЛІЗНЯТЫ.** Паспрабуйце сачыць, каму і што вы кажаце, — вялікая верагоднасць сутыкнуцца з эфектам «сапсаванага тэлефона». У выніку ўсе заблытаюцца і застануцца вельмі незадаволеныя адно адным. Сустракаць гасцей лепш на сваёй тэрыторыі. А да новых знаёмстваў пакуль варта паставіцца скептычна і асцярожна, так што не запрашайце незнаёмцаў, нават калі яны прыходзяць з даўно вядомымі вам людзьмі.

**РАК.** Вы нарэшце адчуеце, што ў вас ёсць сілы для новых здзяйсненняў. Гэта дазволіць прыняць удзел у разнастайных праектах і рашэнні самых незвычайных пытанняў, аб якіх вы нават і думаць раней не маглі. Багацце ідэй дапаможа праявіць сябе ў якасці лідара, заадно раскрыўшы свае арганізатарскія здольнасці. Тыдзень будзе насычаны кантактамі, паездкамі, сустрэчамі. У выходныя дні абавязкова знайдзіце час для старых сяброў.

**ЛЕЎ.** Тыдзень неадназначны. Начальству можа не спадабацца ваша сваволле і занятасць не па справе ў працоўны час. У панядзелак штосьці можа заспець вас знянацку, затое аўторак і серада прынясуць жаданы поспех. На чацвер не варта планаваць важныя перамовы, таму што, хутчэй за ўсё, вы на іх спозніцеся. Да выхадных у сям'і адновіцца атмасфера даверу і паразумення.

**ДЗЕВА.** Здзівіце навакольных. Паспрабуйце толькі, каб іх эмоцыі па гэтай падставе былі станоўчымі. У сераду вашы тайны могуць адкрыцца, прычым не факт, што іх апублікаванне пойдзе вам на карысць. У чацвер з'явіцца шанц падняць свой аўтарытэт і знайсці агульную мову нават з самымі складанымі людзьмі. Пачынаць новыя справы можна, але не варта чакаць, пакуль вас да гэтага падштурхнуць — усё давядзецца рабіць самастойна, і вельмі пажадана пачаць да таго, пакуль неабходнасць гэтага стане няўхільнай.

**ШАЛІ.** Лёс будзе выпрабоўваць вас на трываласць, аднак вы лёгка пераадолееце перашкоды — асабліва калі не будзеце звяртаць увагі на плёткі і чуткі. Не варта баяцца перамен — паспрабуйце адхіліцца ад коснасці састарэлых уяўленняў. Нават пры невялікіх намаганнях у гэтым кірунку вы дасягняце істотных вынікаў. Апынуўшыся перад адказным выбарам, выявіце стрыманасць і карэктнасць у выразах.

**СКАРПІЁН.** Час рухацца наперад — смела можаце пашыраць свой бізнэс або прыступаць да новага віду дзейнасці. З'явіцца неабходнасць даволі часта звяртацца да кампрамісных рашэнняў: талент дыпламата будзе шанавацца больш, чым прынцыповасць. Паспрабуйце складаць план на кожны наступны дзень — гэта дазволіць многае паспець. Пажадана не ўвязвацца ў інтрыгі супраць начальства, інакш давядзецца шукаць новае месца працы. Паспрабуйце не адмаўляць у дапамозе і рыхтуйцеся яе прапанаваць, калі адчуеце, што вас саромеюцца папрасіць.

**СТРАЛЕЦ.** Узрасце нагрузка інтэлектуальнага характару, і ад вас запатрабуецца больш адказнасці. Панядзелак, напэўна, расчаруе ў дзелавой сферы, але падтрымае маральна пры сяброўскіх сустрэчах. У сярэдзіне тыдня магчыма паляпшэнне адносін са сваякамі. Чацвер можа прынесці творчае натхненне і незвычайныя новыя ідэі. Субота будзе спрыяць і прыняццю канструктыўных рашэнняў і актыўным дзеянням.

**КАЗЯРОГ.** Неўсвядомлена будзеце цвяліць фартуну — і цалкам дарма. Трымайце сябе ў руках, бо праявы рызыкі цяпер цалкам недарэчныя. Зрэшты, роўна як і крыўдлівасць з амбітнасцю. Давядзецца некаторы час паводзіць сябе цішэй вады, ніжэй травы. Пажынаць плён сваёй працы будзеце крыху пазней. Вашы празорлівасць і інтуіцыя апынуцца на вышыні, надзяліўшы вас здольнасцю пазбягаць канфліктных сітуацый. Можа змяніцца меркаванне аб некаторых сябрах. Філасофскі падыход да жыцця дазволіць выйсці на больш высокі ўзровень свядомасці.

**ВАДАЛЕЙ**. Спатрэбяцца такія якасці, як прадбачлівасць і ўменне імгненна прымаць рашэнні. У панядзелак вашы адносіны з начальствам могуць быць напружанымі, што, магчыма, праявіцца ў прэтэнзіях і ўзнікненні канфліктнай сітуацыі. У аўторак будзьце больш асцярожнымі з навакольнымі. Чацвер — вельмі ўдалы дзень для вучобы. У суботу дзелавыя перамовы могуць апынуцца вельмі плённымі.

**РЫБЫ.** Неабходна заняцца завяршэннем найважнейшых спраў, якія адкладаліся на потым. Асцярожней з нявыкананымі абавязацельствамі — яны могуць стварыць мноства праблем у найбліжэйшай будучыні і прывесці да сур'ёзных памылак у прафесійнай сферы. Праявіце сяброўскія пачуцці да навакольных, і да вас прыйдзе неабходная падтрымка. У першай палове тыдня засяродзьцеся на галоўным, цяпер не час распыляць каштоўныя сілы па дробязях. У суботу выбірайцеся да сяброў на вечарынку: вясёлая кампанія развее журботныя думкі.

## ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

### Нядзеля, 1 мая

Можна займацца перадачай і атрыманнем інфармацыі, любымі відамі творчасці. Гэта дзень свят, задавальнення і адпачынку.

### Панядзелак, 2 мая

Перастаўце мэблю ў спальні, калі хочаце ажывіць любоўную сувязь. Каб актывізаваць сяброўскія сувязі, зрабіце перастаноўку ў гасцінай.

### Аўторак, 3 мая

Гэта дзень утойвання. Можна штосьці рэкламаваць, а іншыя справы не будуць паспяховымі. Для большасці падзей гэты дзень нешчаслівы.

### Серада, 4 мая

Вывучайце рамёствы, заключайце здзелкі, падарожнічайце. Усё гэта спрыяльна. Сцеражыцеся пахавальных цырымоній; астатнія справы таксама небяспечныя.

### Чацвер, 5 мая

У гэты дзень лепш займацца толькі бягучымі справамі. Адкладзіце пытанні працаўладкавання, фінансавыя аперацыі і перамовы. Карысныя ачышчальныя, аздараўленчыя працэдуры

### Пятніца, 6 мая

Дзень спрыяльны для бізнэсу, навучання, пасрэдніцкай дзейнасці. Па магчымасці адкладзіце высвятленне юрыдычных пытанняў і пачатак судовых разглядаў.

### Субота, 7 мая

Адчыняйце засекі, гандлюйце, адпраўляйцеся на курсы, арганізоўвайце вяселлі, будзьце актыўныя, капайце зямлю. Усе гэтыя справы будуць спрыяльныя.

## Урэзаўся ў запраўку і прапанаваў ДАІ хабар

**У Лепельскім раёне вадзіцель, які знаходзіўся за рулём у нецвярозым стане, урэзаўся ў аўтазаправачную станцыю і пасля гэтага спрабаваў даць хабар супрацоўніку ДАІ — 400 тысяч рублёў.**

Як паведаміў «Звяздзе» Яўген Лапкоўскі, начальнік аддзела па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю пракуратуры Віцебскай вобласці, як потым устанавілі, гэты вадзіцель паўторна быў затрыманы за тое, што кіраваў аўто ў нецвярозым стане. Таму пабаяўся, што можа быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. І, каб пазбегнуць справядлівага пакарання, спрабаваў даць хабар супрацоўніку ДАІ. За свае дзеянні прыцягнуты да крымінальнай адказнасці: і за ваджэнне «пад мухай», і за спробу даць хабар.

А грамадзянін Расійскай Федэрацыі, кіруючы транспартным сродкам, і не маючы дакументаў, якія маглі б пацвердзіць паходжанне грузу, таксама спрабаваў даць хабар прадстаўнікам ДАІ — 6 тысяч расійскіх рублёў, каб не прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Логойский сельский исполнительный комитет

Логойского района Минской области

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов в Логойском районе, в том числе:

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Заозерье, уч. № 5 623284602101000139 | 0,1387 | 6 710 861 | 1 681 104 |
| 2 | д. Заозерье, уч. № 4 623284602101000140 | 0,1500 | 7 257 600 | 1 681 104 |
| 3 | д. Августово, уч. № 31 623284600201000194 | 0,2014 | 7 673 823 | 1 528 911 |
| 4 | д. Августово, уч. № 30 623284600201000193 | 0,2009 | 7 654 772 | 1 528 911 |

**Примечание:** имеются ограничения в использовании участков № 5 и № 4 в связи с охранной зоной линии электропередач.

Задаток в размере 10% от начальной стоимости земельного участка перечисляется на р/с 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 18 мая 2011 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, ком. № 7.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 15 мая 2011 года по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, ком. № 7.

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- ❖ Оценка оборудования и транспортных средств
- ❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ❖ Независимая строительная экспертиза

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ДСТ № 2, г. ГОМЕЛЬ»**

| № лота | Наименование объекта | Адрес объектов продажи | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Пилорама Р63-4П (инв. № 21) | г. Речица, ул. Энергетиков, 1 | 39 794 000 | 1 989 700 |
| 2 | Здание растворного узла | | 35 630 000 | 1 781 500 |
| 3 | Аспирационная установка (инв. № 23) | | 8 608 000 | 430 400 |
| 4 | Аспирационная установка (инв. № 29) | | 8 608 000 | 430 400 |
| 5 | Аспирационная установка (инв. № 33) | | 8 608 000 | 430 400 |

**Продавец имущества**: Управляющий в деле о банкротстве СП «Брювинг Индустри Суплайс-БИС» ООО. Цена указана без НДС. Условия продажи: без условий. Шаг аукционных торгов – 5%.

Более подробную информацию об условиях и перечне документов для участия в аукционе можно узнать у организатора торгов ГОУ филиала «Центр «Белтехинвентаризация» по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а и по тел. 8(0232) 77 37 27, 77 48 39 (факс), WWW.@BTI.by

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления, внесения задатка** | **До 17.00 31 мая 2011 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **01 июня 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012105618010 в Региональной Дирекции №700 ОАО «БПС-БАНК» по г. Минску, пр-т Машерова, 80, код 369, УНП 102353509 |
| **Условие продажи** | Без условий. |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность. |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 48 39 (факс).**

**Ликвидационная комиссия ЗАО «Окнест»**
**ПРОВОДИТ ТОРГИ**
**ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ:**

■ **Капитальное строение площадью 1878,2 кв. м (незавершенное строительством здание склада-магазина) начальной стоимостью: 2 221 365 900 белорусских рублей без учета НДС.**

■ **Капитальное строение площадью 132,6 кв. м (незавершенное строительством здание мастерской) начальной стоимостью: 144 820 000 белорусских рублей без учета НДС.**

Объекты расположены на земельном участке площадью 0,7818 га по адресу: г. Брест, ул. Катин Бор, 109.

**Торги состоятся 31 мая 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Катин Бор, 109.**

Ознакомление с условиями торгов, оформление заявки и предоставление документов для участия в торгах производится по адресу: г. Брест, б-р Шевченко, 4, к. 421. Тел./факс 8 0162 20 52 85, 22 02 33. Заявки принимаются **до 30 мая 2011 г.**

УНП 200698705

**Калинковичский районный исполнительный комитет (Гомельская область)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**По продаже земельного участка в частную собственность негосударственным юридическим лицам, индивидуальным предпринимателям и гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного двухэтажного жилого дома по адресу: Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Братьев Ясковец, 8, площадь участка 0,1037 га, кадастровый номер 322350100003003710.**
**Начальная цена продажи 6844200 белорусских рублей.**

Ограничений в использовании нет. К земельному участку подведены инженерные коммуникации (газ, вода, канализация, электроэнергия). Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 470772 белорусских рубля и затраты на объявления в СМИ. Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на счет Калинковичского райисполкома № 3641419000261, ЦБУ № 313 филиала 317 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Калинковичи, код 678, УНН 400061401. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Возможность ознакомиться с земельными участками предоставляется продавцом в срок до **3 июня 2011 года.**

Аукцион состоится **09.06.2011 года в 10.00** по адресу: Гомельская область, г. Калинковичи, пл. Ленина, 1 (райисполком).

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения **до 17.30 3 июня 2011 года** по адресу: г. Калинковичи, ул. Князева, 4, кабинет 218 (землеустроительная служба Калинковичского районного исполнительного комитета).

**Контактные телефоны: 8 (02345) 33 855, 32 600.**

Организация:
**Открытое акционерное общество «БРАНДКО»**

Учетный номер плательщика: **УНП 800002642**
Вид деятельности: **Оптовая торговля и производство виноградных вин**
Организационно-правовая форма: **Открытое акционерное общество**
Орган управления: **Юридическое лицо без ведомственной подчиненности**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220102, г. Минск, ул. Варвашени, 18-3А**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2011 г.**

| АКТИВ | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|
| 1 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | **1 351** | **1** |
| Основные средства (остаточная стоимость) | 1 351 | - |
| первоначальная стоимость | 1 806 | 1 |
| амортизация | 455 | 1 |
| Нематериальные активы (остаточная стоимость) | - | - |
| первоначальная стоимость | 1 | - |
| амортизация | 1 | - |
| Вложения во внеоборотные активы | - | 1 |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | **7 510** | **4 852** |
| Запасы и затраты | 4 236 | 182 |
| сырье, материалы и другие аналогичные активы | 128 | 1 |
| расходы на реализацию | 120 | 22 |
| готовая продукция и товары для реализации | 2 538 | - |
| товары отгруженные | 1 442 | 142 |
| расходы будущих периодов | 8 | 17 |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 15 | 8 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 565 | 399 |
| покупателей и заказчиков | 5 | 4 |
| поставщиков и подрядчиков | 59 | 39 |
| по налогам и сборам | 47 | 5 |
| по расчетам с персоналом | 308 | 283 |
| разных дебиторов | 146 | 68 |
| Денежные средства | 3 | 3 |
| Финансовые вложения | 2 691 | 4 260 |
| **БАЛАНС** | **8 861** | **4 853** |

| ПАССИВ | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|
| 1 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | **2 230** | **1 174** |
| Уставный фонд | 441 | 441 |
| Добавочный фонд | 960 | 925 |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 821 | -200 |
| Доходы будущих периодов | 8 | 8 |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **-** | **401** |
| Долгосрочные кредиты и займы | - | 401 |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **6 631** | **3 278** |
| Краткосрочные кредиты и займы | 3 720 | 3 153 |
| Кредиторская задолженность | 1 734 | 125 |
| перед поставщиками и подрядчиками | 1 524 | 20 |
| перед покупателями и заказчиками | 43 | 97 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 55 | 7 |
| по налогам и сборам | 101 | 1 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 11 | - |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 1 177 | - |
| **БАЛАНС** | **8 861** | **4 853** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**с 1 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.**

| Наименование показателей | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 4 796 | 15 298 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 1 183 | 3 505 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | 3 613 | 11 793 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 3 734 | 9 503 |
| Расходы на реализацию | 1 338 | 785 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ** | **-1 459** | **1 505** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | |
| Операционные доходы | 1 772 | 3 354 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 38 | 1 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 1 734 | 3 353 |
| Операционные расходы | 1 579 | 3 304 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов** | **155** | **49** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | |
| Внереализационные доходы | 31 | 276 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | - | 18 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) | 31 | 258 |
| Внереализационные расходы | 850 | 1 050 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов** | **-819** | **-792** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **-2 123** | **762** |
| Налог на прибыль | - | 244 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 18 | 59 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 1 | 4 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)** | **-2 142** | **455** |

**Генеральный директор** **Лизунов С.А.**
**Главный бухгалтер** **Лизунова О.М.**

# Кадравы дэфіцыт у дашкольных установах набыў хранічны характар

**Ад чаго ў першую чаргу залежыць якасць адукацыі? Ад вучэбных праграм, адукацыйных стандартаў ці ўсё ж такі ад прафесіяналізму педагагічных кадраў? Як максімальна эфектыўна ацаніць уклад у выхаванне падрастаючага пакалення кожнага педагога? За апошні год даходы работнікаў адукацыйнай галіны падраслі, але ці магчыма гаварыць аб вырашэнні праблемы ўвогуле? Чаму заробкі ў выкладчыкаў меншыя за аспіранцкую стыпендыю? Што хвалюе педагогаў, якія працуюць у раёнах, што пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы? Гэтыя і многія іншыя праблемы ўзнімаліся на II пленуме Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, удзел у якім узялі намеснік міністра адукацыі Казімір Фарыно, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір Здановіч, прадстаўнікі сістэмы адукацыі з усіх рэгіёнаў, старшыні рай- і гарвыканкамаў.**

— На працягу 2007—2010 гадоў быў прыняты цэлы шэраг рашэнняў па павышэнні заробкаў работнікам сістэмы адукацыі: устаноўлены даплаты маладым спецыялістам, павялічаны памеры даплат за вучоныя ступені, павышаны тарыфныя аклады педагагічных работнікаў і памочнікаў выхавацеляў у дашкольных установах, устаноўлены надбаўкі кіраўнікам агульнаадукацыйных устаноў за наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі педагагічнага работніка і гэтак далей. Усе гэтыя меры дазволілі забяспечыць рост заработнай платы больш чым 270 тысяч работнікаў галіны, што складае 63,5 працэнта ад агульнай іх колькасці, — паведаміў у сваім выступленні **намеснік міністра адукацыі Казімір ФАРЫНО.** — Аднак усё роўна прынятыя меры па ўдасканаленні аплаты працы работнікаў адукацыйнай галіны з'яўляюцца недастатковымі...

У сувязі з устанаўленнем спецыялістам надбавак за кваліфікацыйныя катэгорыі ўзнікла дыспрапорцыя ў аплаце працы асобных кіраўнікоў і спецыялістаў структурных падраздзяленняў. Узровень аплаты працы галоўных бухгалтараў, загадчыкаў лабараторый, начальнікаў аддзелаў па асноўнай дзейнасці і іншых кіраўнікоў структурных падраздзяленняў устаноў адукацыі сёння ніжэйшы за заробкі спецыялістаў, якія працуюць у гэтых падраздзяленнях, што выклікае справядлівыя негатыўныя водгукі. Не могуць пахваліцца сваімі заробкамі метадысты, работнікі пазашкольных устаноў, многія катэгорыі тэхнічных работнікаў, без удзелу якіх таксама немагчыма функцыянаванне адукацыйнай галіны. Прычым гэтыя праблемы зусім не новыя, аб чым сведчыць значная колькасць вакансій на гэтых пасадах.

— Лічу, што дзейная сістэма налічэння заработнай платы састарэла, яна не стымулюе, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір ЗДАНОВІЧ.** — Безумоўна, ёсць прэміраванне, надбаўкі, але толькі гэтымі рычагамі пытанне стымулявання працы ў глабальным сэнсе вырашыць немагчыма. Патлумачу, што я маю на ўвазе: напрыклад, адзін настаўнік вядзе матэматыку ў адной паралелі, а іншы выкладае прадмет у 5, 6, 7, 9 класах — нагрузка непараўнальная, а заробак адзін. Катэгорыі таксама не заўсёды стымулююць на неабходным узроўні творчасць і выніковасць працы педагога.

## ВЫХАВАЛЬНІК — ПРАФЕСІЯ НЕПРЭСТЫЖНАЯ?

Асобна ў сваім выступленні на пленуме **старшыня ЦК Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА** спыніўся на праблеме нізкага ўзроўню аплаты працы педагагічных работнікаў дашкольных устаноў, асістэнтаў, выкладчыкаў, старшых выкладчыкаў, перш за ўсё маладых спецыялістаў, якія працуюць у вышэйшай школе. Між іншым, гэтыя катэгорыі работнікаў ВНУ складаюць 53 працэнты ад агульнай колькасці прафесарска-выкладчыцкага саставу. Сёння заробкі старшых выкладчыкаў меншыя за аспіранцкую стыпендыю! На прафесарска-выкладчыцкі састаў ВНУ, на жаль, не распаўсюдзілася рашэнне ўрада аб павышэнні на 25 працэнтаў тарыфных ставак педагагічным работнікам бюджэтных арганізацый і ўстанаўлення штомесячных даплат у памеры адной тарыфнай стаўкі першага разраду маладым спецыялістам.

— Галіновы прафсаюз пастаянна звяртаў увагу органаў дзяржаўнага кіравання на нізкі статус работнікаў устаноў дашкольнай адукацыі. Міністэрства адукацыі і ЦК прафсаюза ў сваіх галіновых пагадненнях бралі на сябе абавязак дабівацца зніжэння працягласці працоўнага тыдня выхавальніка да 30 гадзін. На жаль, гэтая праблема па сённяшні дзень не вырашана, — канстатаваў Аляксандр Бойка. — У той жа час сярэднямесячная заработная плата выхавальніка складае 850 тысяч рублёў, а памочніка выхавальніка — 560 тысяч рублёў. Натуральна, што ўсё гэта не можа не адбівацца на кадравым забеспячэнні сістэмы дашкольнай адукацыі. Асаблівая праблема дэфіцыту кадраў абвастрылася пасля зніжэння ў работнікаў дашкольных устаноў працягласці асноўнага адпачынку.

За 2010 год колькасць вакантных пасад ва ўстановах адукацыі павялічылася дадаткова на 17,9 працэнта: з 3126 у 2009 годзе да 3687 летась. **У дзіцячых дашкольных установах не хапае па краіне 731 выхавальніка (у 2009 годзе — 626), 641 медыцынскага работніка (у 2009 годзе — 590), 576 памочнікаў выхавальнікаў (у 2009 годзе — 250) і 263 кіраўнікі па фізічным выхаванні (у 2009 годзе — 209).**

Асабліва складаная сітуацыя з недахопам выпускнікоў па адпаведных спецыяльнасцях склалася ў Мінску і Віцебску. Вакансіі ў дашкольных установах прапануюцца там выпускнікам няпрофільных педагагічных спецыяльнасцяў з наступнай іх перападрыхтоўкай, аднак прыступіць да работы з дзецьмі маладым спецыялістам даводзіцца ўжо ў жніўні. Пры гэтым колькасць дашкольных устаноў, якія вымушаны працаваць ва ўмовах перагрузкі, калі замест 20 дзяцей у групе знаходзяцца ад 25 да 32 дзяцей, пастаянна павялічваецца.

Усё гэта сведчыць толькі аб адным: без істотнага павышэння статусу работніка ўстановы дашкольнай адукацыі кадравыя праблемы ў гэтай сферы нам ніколі не вырашыць. Прычым паралельна са значным павелічэннем набору на спецыяльнасці, дзе рыхтуюцца кадры для дашкольных устаноў, мы павінны ствараць і ўмовы для прыцягнення ў ВНУ якаснага абітурыента, а таксама ствараць умовы для замацавання кадраў у дашкольных установах.

## АДЗІН РАЁН, АЛЕ ТАКІЯ РОЗНЫЯ ЎМОВЫ...

**Старшыня Веткаўскага раённага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі Васіль САМКОЎ,** у сваю чаргу, засяродзіў увагу ўдзельнікаў пленума на тых «нюансах», з якімі даводзіцца сутыкацца штодня жыхарам так званай «чарнобыльскай зоны». Веткаўскі раён — адзін з рэгіёнаў, які ў найбольшай ступені пацярпеў ад чарнобыльскай катастрофы:

— Што прымушае нас хвалявацца? У зоне радыяцыйнага забруджвання пытанні працаўладкавання, устанаўлення гарантый і кампенсацый, аднаразовых выплат, арганізацыі прыёму на работу, у тым ліку і маладых спецыялістаў, паралельна з Працоўным кодэксам рэгулююцца Пастановай Савета Міністраў № 1842 ад 29.10. 1998 года і прынятымі да яе пазней дапаўненнямі. Гэта пастанова ўстанаўлівае гарантаванае павышэнне тарыфнай стаўкі (акладу) за работу па кантракце, зыходзячы з разліковых 30 працэнтаў да іх, а таксама выплату аднаразовай дапамогі работніку, які заключыў кантракт у залежнасці ад зоны забруджвання радыенуклідамі ў памеры ад 40 да 50 базавых велічынь, грашовыя выплаты пасля года, двух і трох гадоў работы — адпаведна 10, 12 і 15 тарыфных ставак першага разраду.

> **«Складана патлумачыць выпускнікам адной ВНУ, якія прыехалі на работу у адзін і той жа раён, але ў «чысты населены пункт», што ў іх розныя ўмовы аплаты і стымулявання працы, хоць і пражываюць яны нярэдка на тэрыторыі аднаго сельскага Савета...»**

З аднаго боку, згаданыя гарантыі сапраўды кампенсуюць асаблівасці, характар і ўмовы працы ў зоне павышанай увагі, даюць магчымасць істотна павысіць заработную плату, а таксама матэрыяльна падтрымаць маладых людзей, якія прыехалі па накіраванні ў арганізацыі і ўстановы «забруджанага» раёна. Але, з іншага боку, у нас устаноўлены і так званыя «чыстыя зоны», дзе на маладых спецыялістаў не распаўсюджваецца вышэйзгаданая «чарнобыльская» пастанова. Таму даволі складана патлумачыць выпускнікам адной ВНУ, якія прыехалі на работу у адзін і той жа раён, але ў «чысты населены пункт», што гэты заканадаўчы акт урада на іх не распаўсюджваецца і што ў іх розныя ўмовы аплаты і стымулявання працы, хоць і пражываюць яны нярэдка на тэрыторыі аднаго сельскага Савета. Да таго ж у забруджаных населеных пунктах бярэцца пад увагу і той факт, ці быў раней прапісаны ў гэтым пункце малады спецыяліст і ці змяняў ён прапіску падчас вучобы. Калі не змяняў, то 40 базавых велічынь ён не атрымае, паколькі не трапляе пад класіфікацыю «спецыяліст, які прыбыў з-за межаў «забруджанага раёна». Дэпартамент па ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС, куды прафсаюз звяртаўся, каб вырашыць гэтую праблему, не мае нічога супраць ажыццяўлення выплат усім маладым спецыялістам, незалежна ад месца іх рэгістрацыі, але Міністэрства працы выступае супраць.

Другая праблема, на якой спыніўся Васіль Самкоў, тычыцца забеспячэння жылой плошчай работнікаў і маладых спецыялістаў. На тэрыторыі раёна ажыццяўляецца вялікі аб'ем будаўніцтва службовага жылля. Толькі на працягу 2010 года новыя добраўпарадкаваныя кватэры ў г. Ветка атрымалі чатыры спецыялісты адукацыі, у тым ліку і маладыя спецыялісты. Прасочваецца станоўчая дынаміка кааператыўнага будаўніцтва. Толькі для забеспячэння жыллем спецыялістаў, якія прыбылі ў раён на працягу мінулага года, было выдзелена 25 адзінак жылой плошчы з розных крыніц.

— У бягучым годзе чакаецца выдзяленне яшчэ 4 кватэр у раённым цэнтры для нашых работнікаў, — паведаміў Васіль Самкоў. — За гэтым стаіць вялікая напружаная работа прафсаюзаў на месцах, іх сумесная работа з органамі выканаўчай улады і наймальнікамі. Аднак пры гэтым трэба адзначыць, што **працэс выдзялення жылля як у якасных, так і ў колькасных суадносінах пакідае жадаць лепшага.** Узнікаюць цяжкасці з размяшчэннем іншагародніх спецыялістаў у райцэнтры, у шэрагу сельскіх населеных пунктаў. Хацелася б больш спагадлівай рэакцыі з боку кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў на нашы хадайніцтвы аб выдзяленні службовага жылля, бо работнікі адукацыі навучаюць у тым ліку і дзяцей работнікаў мясцовых гаспадарак. Да таго ж і колькасць маладых спецыялістаў, якія прыбываюць у раён, не змяншаецца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Выхавальнікам «дашкольных устаноў варта вярнуць 42 дні адпачынку»

**Як стала вядома журналісту «Звязды», па даручэнні II Пленуму ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі прэм'ер-міністру нашай краіны Міхаілу Мясніковічу быў накіраваны ліст з просьбай пасадзейнічаць станоўчаму вырашэнню праблем у адукацыйнай галіне. У прыватнасці, у звароце звяртаецца ўвага на праблему вострага кадравага дэфіцыту ва ўстановах дашкольнай адукацыі.**

«Колькасць вакантных пасад у гэтых установах у 2010 годзе складала 3687, што на 17,9 працэнта больш, чым у 2009 годзе, — гаворыцца ў лісце. — Праблема ўскладняецца тым, што адначасова з нізкай заработнай платай работнікаў гэтых устаноў ім таксама была значна зніжана працягласць працоўных адпачынкаў, у той час як у Расійскай Федэрацыі, Украіне, Літве, Казахстане, Малдове дзейная раней працягласць працоўных адпачынкаў работнікаў дашкольных устаноў не пераглядалася.

Вырашыць гэтую праблему немагчыма без павышэння сацыяльнага статусу гэтай катэгорыі работнікаў, для чаго неабходна перш за ўсё аднавіць ранейшую працягласць працоўнага адпачынку — 42 каляндарныя дні. Сёння яна складае 30 каляндарных дзён.

Адным з асноўных фактараў прыцягальнасці прафесіі, матывацыі працы з'яўляецца працягласць рабочага часу. Галіновы прафсаюз лічыць неабходным устанавіць скарочаную працягласць працоўнага часу — 30 гадзін у тыдзень выхавальнікам устаноў дашкольнай адукацыі і 36 гадзін у тыдзень педагогам-арганізатарам, педагогам сацыяльным, педагогам-псіхолагам устаноў адукацыі. Па прычыне адсутнасці патрэбы ва ўвядзенні дадатковай штатнай колькасці апошніх устанаўленне ім такой нормы працоўнага часу дадатковых сродкаў не патрабуе».

Звяртаецца ў лісце да кіраўніка ўрада ўвага таксама і на праблемы прафесійнага пенсійнага страхавання: « У сувязі з прыняццем Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 09.10. 2008 года № 1490 «Аб некаторых пытаннях прафесійнага пенсійнага страхавання» абсалютная большасць педагагічных работнікаў страціла магчымасць скарыстацца правам на атрыманне пенсіі за асаблівыя ўмовы працы.

Галіновы прафсаюз лічыць неабходным аднавіць сацыяльную справядлівасць у адносінах да педагагічных работнікаў і з гэтай мэтай вярнуцца да перагляду адпаведных крытэрыяў, устанавіць іх у залежнасці ад характару работы, якая выконваецца для кожнай катэгорыі педагагічных работнікаў, і разглядаць гэтыя крытэрыі ў адносінах да настаўнікаў з уключэннем усіх напрамкаў іх работы ў межах сукупнай нагрузкі на стаўку».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Палеміка**

# КАМУ ВЫГАДНА ПЕРАЎТВАРАЦЬ УСТАЛЯВАННЕ «СПРЭЧНЫХ» ВІЦЕБСКІХ ПОМНІКАЎ У СКАНДАЛ?

Артыкул «Звязды» *«У Віцебску пачалі ўсталёўваць спрэчныя гістарычныя помнікі?»* (за 19 красавіка гэтага года) выклікаў неадназначную палеміку.

Праз два дні на расійскім партале regnum.ru гісторыкаў і журналістаў, якія адважыліся крытыкаваць праект усталявання манументаў, назвалі «апазіцыяй» і «дэструктыўнымі элементамі».

Размова ў матэрыяле «Звязды» вялася пра тое, што ў сакавіку гэтага года ў горадзе над Дзвіной пачалі будаваць пастамент пад помнік Аляксандру Неўскаму. Таксама ў Віцебску плануецца з'яўленне манументаў княжне Вользе і Вялікаму князю Альгерду.

Ідэя некаторых помнікаў выклікала спрэчкі ў грамадстве яшчэ мінулай вясной. Безумоўна, Аляксандр Неўскі і княжна Вольга — знакамітыя дзеячы. Але якой гісторыі? Перш-наперш — гэта героі са школьных падручнікаў нашых сяброў з суседняй Расіі.

А вось прыналежнасць гэтых яркіх дзеячаў да Беларусі і Віцебска выклікае сумневы. У Інстытуце гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі журналісту «Звязды» патлумачылі гістарычныя факты: Аляксандр Неўскі бываў у Віцебску ў 1245 годзе. Прыехаў, забраў свайго сына і з'ехаў назад у родны Ноўгарад. Ці варта за гэта ўсталёўваць яму помнік? А княжна Вольга з'яўляецца толькі легендарнай заснавальніцай горада. Дакладных звестак, што менавіта па яе волі паўстаў Віцебск, — няма.

Толькі да асобы Вялікага князя Альгерда, героя ўжо беларускіх школьных падручнікаў, прэтэнзій у навукоўцаў не было. Пры ім Віцебск дасягнуў росквіту ў эпоху Сярэднявечча.

Тым не менш, будаваць пастамент пад помнік Аляксандру Неўскаму на плошчы Тысячагоддзя ў Віцебску ўсё ж пачалі.

Артыкул на партале regnum.ru *(«Эксперт: Проблема памятников русским князьям в Витебске надумана и политизирована»,* за 21 красавіка 2011 года) напісаны на мяжы фола.

Матэрыял абапіраецца на выказванні Андрэя Герашчанкі, старшыні віцебскага грамадскага аб'яднання «Рускі дом» і начальніка аддзела па справах моладзі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Віцебска. Гэта той самы дзеяч, які ў мінулым годзе «праславіўся» скандальным інтэрв'ю расійскаму парталу «Мацярык», дзе назваў беларускую мову «смесью различных местных диалектов», а легендарнага музыку Уладзіміра Мулявіна, заснавальніка «Песняроў», абвінаваціў у тым, што з-за беларускамоўнай творчасці такія людзі «играют на руку тем недругам Русского мира, что хотят навечно оторвать Белую Русь от России и окончательно лишить белорусов их исконной русскости».

Гэтыя выказванні выклікалі абурэнне ў многіх.

На гэты раз праз партал regnum.ru Андрэй Герашчанка безапеляцыйна называе ўсіх, хто крытыкуе помнікі Аляксандру Неўскаму і княжне Вользе, «нацыяналістамі» і «дэструктыўнымі сіламі»:

Потым пэўныя дэструктыўныя сілы паднялі ў апазіцыйнай прэсе шум аб «расійскім засіллі», і для «ўраўнаважвання» сітуацыі было прынята рашэнне ўсталяваць таксама помнік князю Альгерду — перадае словы Андрэя Герашчанкі regnum.ru. Апазіцыя гэта падтрымала, зыходзячы з тых перакананняў, што Альгерд неаднаразова ваяваў з Маскоўскім княствам».

Нагадаем, што першыя крытычныя артыкулы ў прэсе наконт «спрэчных» віцебскіх помнікаў з'явіліся ў «Звяздзе», у «Беларуси сегодня» і на самым масавым інтэрнэт-партале краіны TUT. BY . Выходзіць, што віцебскі чыноўнік прылічае да «дэструктыўных элементаў» усе гэтыя выданні, у сукупнасці з Нацыянальнай акадэміяй навук.

> **ШТО ДУМАЮЦЬ ЧЫТАЧЫ?**
> Праблема віцебскіх помнікаў актыўна абмяркоўваецца на інтэрнэт-форумах. Пункты гледжання часам выказваюцца дыяметральна розныя.
>
> @
>
> **Erik:** Летапісы кажуць пра Неўскага, што ён быў няўдачнік, падлабуньваўся да татара-мангольскага хана, прымусіў наўгародцаў плаціць чужаземцу даніну...
>
> @
>
> **Pale 1962:** Гэты «няўдачнік» не прайграў ніводнай бітвы ў жыцці, праявіўшы цуды дыпламатыі. Абараніў Ноўгарад ад заняволення татара-манголамі. У жыцці князь, як сведчаць яго сучаснікі, быў сціплы, адкрыты сэрцам. А ў лік святых быў узведзены за тое, што не дазволіў абярнуць паўночны захад Русі ў каталіцтва, якое неслі псы-рыцары, і ў мусульманства, якое неслі татара-манголы. І колькі б ні лілі на яго бруду, ёсць Аляксандра-Неўская лаўра, ордэн Аляксандра Неўскага, сотні храмаў у яго імя, дзясяткі помнікаў па ўсёй Русі. А хутка будзе помнік і ў Віцебску.
>
> @
>
> **Рурык III:** З якога перапуду ў нас павінны ставіць помнікі іншаземным палітычным дзеячам кшталту Аляксандра Неўскага і Вольгі? Мабыць, паставім манументы яшчэ і Чынгісхану, Мантэсуму ды Цэзару?
>
> @
>
> **Licvinchyk:** Я праваслаўны, але лічу, што ў нас ёсць свае героі, якія стварылі ў свой час нацыю. Помнікі найперш патрэбна ставіць ім. Тады і патрыятызм моладзі будзе развівацца ў патрэбным рэчышчы.

Сорамна не толькі за гэта. Князь Альгерд — дзеяч, якога нашы дзеці вывучаюць у школе. Хоць бы за гэта гістарычны муж варты помніка.

«Важна, каб горад упрыгожылі па-сапраўднаму яркія помнікі, якія прастаяць стагоддзі. А што тычыцца нацыяналістаў і іх спроб агульна ахаяць ідэю ўсталявання помнікаў... Як кажуць: «сабака брэша — караван ідзе!» — рэзюмуе Андрэй Герашчанка.

Можа, і праўда не патрэбен нам помнік Альгерду? І гісторыя свая таксама? Заменім нашы школьныя падручнікі на «Гісторыю Расіі». Перайменуем бульвар Мулявіна ў сталіцы на бульвар Карамзіна. У Полацку — дэмантуем помнік першадрукару Францыску Скарыну і заменім яго на манумент Пятру Першаму. Таксама раскручаны персанаж, таксама быў у Полацку ў пачатку 18-га стагоддзя. І нават зрабіў парахавы склад на тэрыторыі самага культавага храма ў гісторыі Беларусі — Сафійскага сабора. Пасля чаго ў 1710 годзе адбыўся выбух — і святыня зруйнавалася дашчэнту.

Але ніхто з беларусаў сёння не піша артыкулы пра тое, што Пётр — гэта вораг Беларусі. Беларусы лічаць усходніх суседзяў найлепшымі сябрамі. Але гэта не азначае, што сябар можа прыйсці ў твой дом і наводзіць тут свае парадкі.

Да гісторыі беларусы таксама ставяцца ліберальна і глядзяць у суверэнную будучыню, куды хацелася б ісці са сваімі героямі, даніна якім яшчэ не аддадзена належным чынам.

Таму гэтая сітуацыя не на руку людзям, якія жадаюць нашай краіне росквіту.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

**ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**30 мая 2011 г. проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение -строительство | Качество земли | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ | Срок аренды (лет) | Затраты на подготовку документации, бел. рублей | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | пересечение улиц Н.Ополчения-Ефремова | 340100000003002465 | 0,0140 | под установку объекта сезонной мелкорозничной торговли и общественного питания | к землям сельскохозяйственного назначения не относятся | Участок свободен от застройки. Ограничений в использовании нет. | 3 | 1 140 191 | 2 090 099 | 209 000 |
| 2 | ул. Владимирова | 340100000005005874 | 0,0176 | | | Участок свободен от застройки. Ограничений в использовании нет. | | 1 310 890 | 2 437 955 | 243 000 |
| 3 | в районе рынка «Осовцы» | 340100000001004963 | 0,0150 | | | Участок свободен от застройки. Ограничений в использовании нет. | | 1 346 501 | 714 644 | 71 000 |
| 4 | по ул. 60 лет СССР | 340100000006004430 | 0,0060 | | | Участок свободен от застройки. Ограничений в использовании нет. | | 1 228 174 | 952 890 | 95 200 |
| 5 | по ул. Хатаевича | 340100000001004967 | 0,0178 | для установки развлекательного тира, аэрохоккея и других развлекательных аппаратов неазартного характера | | Ограничения в использовании: водоохранная зона водоотводящего канала в районе ул. Головацкого – 0,0174 га, водоохранная зона водоотводящего канала, охранная зона линии электропередачи в районе ул. Головацкого – 0,0004 га. Участок свободен от застройки. | | 1 625 766 | 3 307 429 | 330 740 |
| 6 | ул. Лепешинского (район ОАО «Коралл») | 340101000002004934 | 0,1762 | для размещения автомойки | | Ограничений в использовании нет. Участок свободен от застройки. | 50 | 2 119 012 | 59 949 438 | 5 994 940 |
| 7 | ул. Лепешинского | 340100000002004935 | 0,8224 | для размещения производственной базы | | Ограничения в использовании: охранная зона канализации, водопровода, теплотрассы – 0,2167 га. Участок свободен от застройки. | | 2 246 524 | 279 809 428 | 27 980 940 |
| 8 | ул. Каменщикова | 340100000002004933 | 0,1030 | для размещения здания специализированного общественного питания (кафе) | | Ограничений в использовании нет. Участок свободен от застройки. | | 1 487 086 | 108 221 084 | 10 822 100 |
| 9 | ул. Мазурова (в микрорайоне № 16, район жилого дома № 58) | 340100000001004964 | 0,0419 | для размещения магазина по продаже цветочной продукции | | Ограничения в использовании: охранная зона линии связи – 0,0010 га; охранная зона линий электрокабеля напряжением 0,4 кВ – 0,0046 га. Участок свободен от застройки. | 30 | 1 561 453 | 26 624 903 | 2 662 490 |
| 10 | ул. Свиридова (в микрорайоне № 20, в районе жилых домов № 38 и № 44) | 340100000002004930 | 0,0202 | для размещения торгового павильона по продаже цветочной продукции | | Ограничения в использовании: охранная зона линий электрокабеля – 0,0059 га. Участок свободен от застройки. | 10 | 1 643 269 | 4 971 652 | 497 160 |

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. **Аукцион состоится 30 мая 2011 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518, управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того, представляют:

4.1 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.2 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.3 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.4 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

4.5 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители юридических лиц и граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка.

6. Горисполкомом может предоставляться рассрочка на срок не более 3 лет, в случаях когда размер платы за право заключения договора аренды земельного участка превышает 2 000 базовых величин для граждан и индивидуальных предпринимателей и 10 000 базовых величин для юридических лиц. Плательщик, претендующий на получение рассрочки, до принятия горисполкомом решения о предоставлении земельного участка в аренду должен обратиться в горисполком о предоставлении ему рассрочки.

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 24 мая 2011 г.** включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: ул. Советская, 21а (каб. № 4).

Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.40 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

**Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт – www. gorod.gomel.by**

## Дзве даты — 30 красавіка



**1530 год** — нарадзіўся Філон Сямёнавіч Кміта-Чарнабыльскі, беларускі ваенны дзеяч, пісьменнік. У Лівонскай вайне 1558-83 гадоў камандаваў войскамі на ўсходніх рубяжах ВКЛ, удзельнічаў ва ўзяцці Чарнігава, рэйдах да Старадуба, Смаленска. У 1566 годзе прызначаны дзяржаўцам Чарнобыля (адсюль другая частка прозвішча) і старостам аршанскім з абавязкам ахоўваць аршанска-смаленскую мяжу. З Оршы пасылаў у Вільню панамрадзе данясенні аб становішчы на мяжы і аб падзеях у Расіі (захавалася 30 лістоў за 1573-74 гг.). Данясенні напісаныя эмацыйна, публіцыстычна, з выкарыстаннем народных прыказак, яны з'яўляюцца помнікам старажытнабеларускай літаратуры. У 1579 годзе прызначаны ваяводам смаленскім (пасада была намінальная, але давала месца ў Сенаце Рэчы Паспалітай). Памёр у 1587 годзе.

**1986 год** — савецкія газеты змяшчаюць першую інфармацыю аб аварыі на Чарнобыльскай АЭС пад загалоўкам «Ад Савета Міністраў СССР». Насамрэч ніякай змястоўнай інфармацыі там не было, а ўвесь свет ужо чатыры дні знаходзіўся ў паніцы.

**Цытата дня:**

*«Разумны чалавек заўсёды спяшаецца, але нічога не робіць у спешцы».*

**Філіп Чэстэрфілд (1694—1773), англійскі пісьменнік і дзяржаўны дзеяч.**

## НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў МАІ

| | |
|---|---|
| 1, нядзеля, | 14.30 — 23.00 |
| 2, панядзелак, | 1.00 — 5.00 |
| 3, аўторак, | 6.00 — 22.00 |
| 4, серада, | 2.00 — 16.00 |
| 6, пятніца, | 19.00 — 23.00 |
| 7, субота, | 0.00 — 1.30 |
| 9, панядзелак, | 6.00 — 8.30 |
| 11, серада, | 4.00 — 13.00 |
| 13, пятніца, | 2.00 — 15.00 |
| 15, нядзеля, | 15.00 — 15.30 |
| 17, аўторак, | 10.00 — 16.30 |
| 19, чацвер, | 13.30 — 20.00 |
| 21, субота, | 20.00 — 23.00 |
| 22, нядзеля, | 0.00 — 1.30 |
| 24, аўторак, | 6.30 — 13.30 |
| 25, серада, | 17.00 — 23.00 |
| 26, чацвер, | 3.00 — 22.00 |
| 29, нядзеля, | 9.30 — 12.00 |
| 31, аўторак, | 14.30 — 23.00 |

Хочаце — верце...

# ЯКІ ХАРАКТАР У МУЖЧЫНЫ — ТАКІ І ЯГО ПАДАРУНАК

**ПАДАРУНКІ традыцыйна ўспрымаюцца як знакі ўвагі і з'яўляюцца неад'емнымі атрыбутамі чалавечых узаемаадносін. Цікава, што найбольш цяжкасцяў выклікае выбар падарунка для вельмі блізкага чалавека. Куды прасцей знайсці прэзент для шэфа ці калегі, чым для сваёй «палоўы». Пры гэтым дагадзіць мужчыне значна лягчэй, чым жанчыне. Дастаткова памятаць, што ўсе дарослыя прадстаўнікі моцнага полу насамрэч проста вялікія дзеці, якія будуць шчаслівыя, атрымаўшы ў якасці падарунка адну з «мужчынскіх цацак». У гэтую катэгорыю, акрамя функцыянальных (кшталту набору інструментаў, армейскіх ножыкаў, барсетак, партаманетаў, партсігараў, фляжак, DVD-дыскаў, дарагіх канцылярскіх тавараў і піўных кубкаў) уваходзяць самыя недарэчныя і экзатычныя рэчы, напрыклад, самурайскія мячы і кальяны. Нават калі выбіраць падарунак для каханага даводзіцца ў самы апошні момант, пры мінімуме фантазіі і шанцавання можна знайсці нешта вартае.**

Іншая справа — падарунак для жанчыны. Памыліцца тут лягчэй лёгкага, што большасць мужчын і робіць. Аднак псіхолагі раяць жанчынам не сумаваць і выкарыстаць сітуацыю на сваю карысць. Аказваецца, сам падарунак, зроблены мужчынам, можа расказаць шмат цікавага пра характар дарыльшчыка і яго жыццёвыя прынцыпы, а яшчэ намякнуць, як палепшыць вашы адносіны.



### ЗВЫЧАЙНЫ

Гэта заўсёды матэрыяльная рэч, але якая канкрэтна — загадзя не даведацца. Часам гэта нешта дзіўна прыемнае, а часам — проста дзіўнае. Прычым да такой ступені, што ваша здзіўленне не праходзіць тыднямі. А самыя нечаканыя падарункі — кшталту прыбору для замеру электраліту ў акумулятары — вы і на залатым вяселлі будзеце ўзгадваць.

Такі дарыльшчык — самы звычайны мужчына, які валодае ўсімі неабходнымі якасцямі для таго, каб стаць надзейным спадарожнікам па жыцці. Больш часу побач з ім вы адчуваеце сябе камфортна, і толькі напярэдадні святаў пачынае трывожна заміраць сэрца. А ўсё таму, што, у прынцыпе, выбар падарунка — чужы і неарганічны для мужчын занятак, паколькі для гэтага неабходна: памятаць, у які канкрэтна дзень трэба зрабіць падарунак; умець здагадацца пра вашы жаданні па міміцы, рухах і эмацыянальных рэакцыях; знайсці пажаданае ў магазіне, выбіраючы з сотні падобных; сказаць нешта жартаўлівае падчас уручэння падарунка. Выкананне любога з вышэй згаданых пунктаў становіцца для мужчын — у сілу іх псіхафізічных асаблівасцяў — цяжкай задачай. Мужчыны амаль не чытаюць эмоцыі па твару, таму ваша патаемнае захапленне дызайнерскай сумачкай застанецца незаўважаным. Акрамя таго, яны адчуваюць сябе ў магазінах некамфортна: нават у здаровых індывідуумаў праз 20 хвілін павышаецца ціск. А ці можна за такі кароткі час паспець нешта выбраць?

І ўсё ж, выкідваць нязграбны ці непатрэбны падарунак у сметнік з драматычным каментаром кшталту «Цяпер я бачу, што табе да мяне няма справы!» не варта. Рэч усё ж можа спатрэбіцца ў побыце. Ідэальная рэакцыя — падзяка, аздобленая па магчымасці пазбаўленымі сарказму эпітэтамі («Ух ты! Якая форма! Які нечаканы дызайн! Я пакіну яго ў сябе назаўсёды!) Ацаніце веліч ахвяры — ён усё ж ПАСПРАБАВАЎ ВЫБРАЦЬ, а для яго гэта цяжка. Але ўсё ж у наступны раз лепш не спадзявацца на шчаслівы выпадак і загадзя падкарэктаваць працэдуру ўручэння падарунка. Зрабіце намёкі больш празрыстымі і рэгулярнымі (разоў па 25 з інтэрвалам у 2-3 дні), а сваё захапленне ад атрымання сапраўды пажаданай рэчы — эфектным і запамінальным.

### ЗОРКА З НЕБА

Ад ТАКОГА падарунка можна і слязу пусціць. Як ён здагадаўся? Як ТАКОЕ ўвогуле магчыма? Вы ж менавіта пра гэта і марылі літаральна з дзяцінства. Цуды здараюцца, калі ваш партнёр — сапраўдны чараўнік.

Дарыльшчык проста вельмі ўважлівы. Хутчэй за ўсё, вы самі некалі расказвалі яму пра сваю мару, а потым забыліся. А ён запомніў, бо для яго выкананне жаданняў партнёршы мае асаблівае значэнне. Ваша шчырая радасць дастаўляе яму столькі пазітыву, што ён гатовы выношваць ідэю падарунка гадамі, капіць на яго грошы, прыкладаць максімум намаганняў для рэалізацыі вашай мары.

У глыбіні душы ваш дарыльшчык сумуе. Асобы, занятыя здзяйсненнем чужых мар, як правіла, самі не вельмі шчаслівыя. Ім самім не хапае той радасці, якую яны імкнуцца даставіць іншым, і такой любові. Хутчэй за ўсё, вы ў гэтым не вінаватыя: пачуццё «мяне любяць толькі калі я гэтага варты» ідзе з глыбокага дзяцінства. На вас ён пераносіць сваё адчуванне неабароненасці і ад вас чакае павышанай дозы душэўнага цяпла. І не дачакаецца: мы так хутка прывыкаем да добрага стаўлення, што перастаём цаніць, успрымаем як норму. Больш за тое, менавіта ад такіх мужчын жанчыны часцей сыходзяць, пераканаўшыся ў сваёй выключнасці і мяркуючы, што з іншымі прадстаўнікамі моцнага полу іх таксама чакае феерычны поспех. Рэальнасць бывае жудаснай... Другі варыянт развіцця адносін ненамнога лепшы: абсалютна выпадкова вашаму чараўніку можа сустрэцца жанчына больш чуллівая і ўважлівая, здольная даць вашаму мужчыну пачуццё абароненасці, любові, і ацэніць яго падарункі.

Што ж рабіць? Папярэдзіць развіццё абодвух згаданых сцэнароў: ніякіх сыходаў, ніякіх чуллівых жанчын! Не скрывайце сваіх эмоцый і АБАВЯЗКОВА скажыце, што падарунак ЦУДОЎНЫ, што зрабіць яго мог толькі выключны чалавек, якога вы вельмі кахаеце — і з падарункамі, і без... Такому партнёру неабходна атрымліваць цеплыню і каханне часцей, чым іншым мужчынам, а збалаваць яго гэтым проста немагчыма. Вы проста скарэктуеце яго самаацэнку. І вас будуць любіць яшчэ мацней.

### ЗАЛАТЫЯ РУКІ

Зборнік вершаў у жанры хоку, прысвечаны вам? Ён на гэта здатны, нават па-японску. Ваш барэльеф, выкананы на дрэве? Лёгка! Ваш партрэт, выкладзены з палавінак рысавых зярнятак? Чаму ж не! Музеі рэдкасцяў маглі б вам пазайздросціць, паколькі ў вас поўныя скрыні рэчаў, паглядзець на якія выстройваюцца чэргі. Яшчэ б, ні ў каго больш такіх падарункаў няма! Але з часам кожнае свята пачынае выклікаць у вас асацыяцыі з дзетсадаўскімі вырабамі. І хочацца чагосьці іншага (ну, кветачку жывую атрымаць з самай банальнай паштовачкай...). На жаль, па добрай волі вам букецік не падораць.

Крэатыўнасць — аснова асобы вашага партнёра. Ён і знешне непадобны на іншых: то гадзінамі маўчыць, пазіраючы ў акно, то ўсю ноч працуе, а раптам кіне працу і гады два шукае новае прызванне. Ён глыбокі інтраверт, і сярод мужчын разнавіднасці гэтага тыпу сустракаюцца даволі часта. Гэта цікавыя, з незвычайнай душэўнай арганізацыяй людзі, якія на пачатку выклікаюць у жаночым сэрцы вельмі цёплыя пачуцці. Але паступова адасобленасць праяўляецца мацней і пачынае перашкаджаць. Нам, жанчынам, патрэбна ўзаемнасць, цеплыня і ўпэўненасць, што чалавеку без нас дрэнна. А інтраверту без нас добра! Да такой ступені, што ўзнікаюць сумненні — ён увогуле здольны адчуваць хоць што-небудзь? Здольны нават на каханне, проста ўсё гэта выглядае незвычайна. Як і яго падарункі.

Тып нервовай сістэмы змяненням не падлягае, вашы прэтэнзіі такі партнёр не зразумее, а скандалы ён проста не пераносіць. Дык жывіце і не пакутуйце дарэмна. Але, калі, прааналізаваўшы адносіны, вы зразумееце, што плюсоў больш, чым мінусаў, што ўсё роўна хочаце жыць з гэтым мужчынам і завесці агульных дзяцей, проста гэтыя хоку з рысавым зернем вам надакучылі, то варта зрабіць наступнае. Знайсці надзейнага чалавека, да якога ваш партнёр ставіцца станоўча (напрыклад, яго сястра ці нехта з агульных знаёмых), які пачне мякка, але досыць рашуча кіраваць падрыхтоўкай да святаў. Асабліва ў той частцы, якая тычыцца падарунка вам. Гэта адзіны варыянт — сам партнёр ніколі не здагадаецца пра вашы патрэбы і тым больш не пойдзе ў краму нешта выбіраць.

### МЕХ ПРЫКОЛАЎ

Ну, не можа ён гэта зрабіць проста так!.. Яму абавязкова неабходна, каб хто-небудзь пасмяяўся. Нават набыўшы пярсцёнак, ён упакуе футлярчык у прамасленую паперу і пакладзе ў авоську, а потым будзе сачыць за вашай рэакцыяй. Мужчыны, у прынцыпе, схільныя да іранічных жартаў, аднак, калі яго паводзіны не мяняюцца і ўсе падарункі выклікаюць непаразуменне і крыўду, — гэта нагода сур'ёзна задумацца.

Такі дарыльшчык можа адносіцца да аднаго з двух тыпаў, прычым цалкам процілеглых. Першы — бяскрыўдны, вельмі ранімы і няўпэўнены ў сабе чалавек. Жарты і іронія для яго — своеасаблівае прыкрыццё. «Лепш няхай нада мной смяюцца, чым заўважаць мае недахопы» — гэта яго дэвіз. Другі тып не такі бяскрыўдны. Хутчэй, наадварот, ён самаўпэўнены і пагардліва ставіцца да людзей. Падаграваючы сваё пачуццё ўласнай значнасці, дазваляе сабе хамскія паводзіны. Рэдка — калі ён не скандальны і не агрэсіўны — атрымліваецца паставіць яго на месца.

З тыпам № 2 варта весці сябе аналагічным чынам, якім бы цяжкім гэта вам ні падавалася (у партнёры такія людзі выбіраюць асоб мяккіх і ўражлівых): дарыце яму тое, пра што ва ўсіх парадах значыцца як «НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ!». Гэта можа быць, напрыклад, дэзадарант для мужчын, што пакутуюць на павышаную патлівасць, ці сродак для ўзмацнення эрэкцыі з запіскай «Спадзяюся, усё пройдзе паспяхова». І яшчэ — не забудзьцеся арганізаваць скандал і не саромейцеся ў выбары эпітэтаў у яго адрас. Парада жудасная, але што рабіць? Такія людзі могуць «піць кроў» сваіх блізкіх усё жыццё.

А тыпу № 1 трэба дапамагчы. Для таго, каб ён расслабіўся, намагайцеся часцей аказваць яму падтрымку, унушаць упэўненасць ва ўласных сілах.

### ГРОШЫ, ЦІ ПРАПАНОВА ВАМ САМОЙ СХАДЗІЦЬ І ВЫБРАЦЬ САБЕ ПАДАРУНАК

Ёсць мужчыны, якія адмаўляюцца прымаць правілы гульні, таму напярэдадні вашага дня нараджэння яны могуць сказаць: «Заўтра я па справах ад'еду, ты сама штонебудзь знайдзі ў магазіне, а я аплачу, калі вярнуся». Жанчыну такія паводзіны задавальняюць толькі ў адным выпадку: калі партнёра яна ненавідзіць, выйшла замуж па разліку і ў яе ёсць той, хто заўтра яе парадуе па-сапраўднаму.

У свядомасці такога партнёра адносіны займаюць так мала месца, што ніякага негатыву ў сваіх паводзінах ён не заўважае. Была б яго воля, ён увогуле б адмяніў традыцыю дарыць падарункі. Гэта занадта стамляе. Хутчэй за ўсё, такая пазіцыя сфарміравалася яшчэ ў сям'і яго бацькоў, тата і мама не вельмі любілі сюрпрызы і святы. Паспрабуйце высветліць, да якога ўзросту да яго прыходзіў Дзед Мароз, вельмі верагодна, што ніколі.

Для выпраўлення сітуацыі варта ўзяць на ўзбраенне новыя правілы — тыя, якія больш будуць падабацца вам і вашым дзецям. Абавязкова ўключыце сюды бурныя віншаванні з пяшчотнымі пацалункамі і сотнямі добрых слоў, сюрпрызы і падарункі з любой нагоды.

**Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.37 | 20.38 | 15.01 |
| Віцебск — | 5.22 | 20.32 | 15.10 |
| Магілёў — | 5.27 | 20.28 | 15.01 |
| Гомель — | 5.28 | 20.20 | 14.52 |
| Гродна — | 5.53 | 20.53 | 15.00 |
| Брэст — | 5.58 | 20.48 | 14.50 |

**Месяц**

*Маладзік 3 мая.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

*Пр.* Аляксандра, Ананіі, Андрыяна, Засімы, Івана, Сямёна, Фёдара.

*К.* Катарыны, Ліліі, Барталамея, Ігара, Людвіка, Мар'яна.







## Усміхнемся

**Пачула такую прыказку: «Хто чаго баіцца — тое з тым і здарыцца». Зараз вельмі баюся разбагацець і пахудзець.**

☺

Ваенкамат. Прызыўнік у акуліста:
— Ты бачыш трэці радок.
— Не!
— Гэта было не пытанне.

☺

**Катаючыся на амерыканскіх горках з настаўніцай рускай мовы, дзеці даведаліся шмат выключэнняў з правілаў.**

☺

У краме:
— Мне, калі ласка, грэчкі.
— Колькі штук?

☺

**— Афіцыянт, я ж заказваў морапрадукты!**

**— Я і прынёс макароны пафлоцку.**

☺

— На што скардзіцеся, хворы?
— На здароўе.
— Гэта вы дарэмна. Трэба скардзіцца на хваробы.

☺

**Позірк адной дзяўчыны на другую нагадвае кантроль багажу на мытні.**



# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СМАЧНА ЕСЦІ

## Падножны корм



**Нарэшце веснавое сонейка пачало па-сапраўднаму прыграваць. Дзе-нідзе зазелянела траўка. Паказаліся першыя лісточкі дзьмухаўца і крапівы. І гэтыя расліны зараз могуць стаць сапраўднай крыніцай папаўнення вітамінаў, мікраэлементаў і іншых карысных рэчываў у нашым арганізме. Як толькі паказаліся з зямлі першыя маладыя парасткі — збіраем і ядзім.**

**САЛАТА З КРАПІВЫ**

Лісты крапівы пакласці ў кіпень і варыць на маленькім агні 1-2 хвіліны. Адкінуць на друшляк, парэзаць. Адвар ні ў якім разе не выліваць. Яго можна дадаць у суп з капусты ці боршч, а можна і проста выпіць замест вады невялікімі дозамі на працягу дня. Рэпчатую цыбулю пасмажыць на алеі да мяккасці і прама на скавародку выкласці нарэзаную крапіву і варанае яйка, пасаліць, перамяшаць. Можна дадаць крыху маянэзу ці смятаны, але неабавязкова. І так будзе смачна.

З крапівы можна таксама прыгатаваць бацвінне, пюрэ. Самая карысная ранняя майская. Можна нарыхтаваць гэтую траву на зіму. Зрэзаць у расліны трэба вярхушку на тры ярусы лістоў. Сушаную крапіву можна не варыць, а проста заліць кіпенем — лісточкі адразу стануць мяккімі і гатовымі да прыгатавання страў.

**САЛАТА З КРАПІВЫ І ДЗЬМУХАЎЦА**

Змяшайце здробненыя лісты дзьмухаўца і крапівы (яе павінна быць у два разы больш), дадаць зялёную цыбулю і здробнены часнок. Для запраўкі змяшаць 2 сталовыя лыжкі журавінавага соку, 1 лыжку расолу квашанай капусты і 2 лыжкі алею. Гэтым соусам заправіць салату і ўпрыгожыць грэцкімі арэхамі.

**САЛАТА «ВЯСНА»**

Лісточкі дзьмухаўца папярэдне вымачыць у салёнай вадзе цягам 30 хвілін.

Змяшаць 200 гр. лісточкаў маладой крапівы, 100 гр. шчаўя, 50 гр. дзьмухаўца, 100 гр. лісця трыпутніку і 100 гр. лісця цыбулі. Атрыманую масу змяшаць з 2 варанымі яйкамі, запраціць алеем ці маянэзам, пасаліць па смаку і ўпрыгожыць салату зелянінай пятрушкі і кружочкамі радыскі.

## Хачу кашу!



**Усе бацькі ведаюць, што дзецям вельмі карысна есці розныя кашы. Але нашы дзеткі часам зусім не весела пазіраюць на талерку. Паспрабуйце прапанаваць ім традыцыйную кашу ў нетрадыцыйным афармленні. Ніхто не адмовіцца.**

Каб манную кашу ператварыць у вясёлае сонейка, спатрэбіцца варэнне жоўтага і аранжавага колеру, а таксама некалькі лыжачак апельсінавага соку. «Шавялюру« можна зрабіць з цёртага шакаладу, а носік — з ягадкі ці кавалачка кургі.



А грэцкая каша ператвараецца ў коціка пры дапамозе некалькіх кавалачкаў сардэлькі ці каўбасы, парачкі кольцаў агурка і варанай бульбы (можна замяніць бялком яйка), адной масліны, кроплі кетчупу (можна замяніць кавалачкам чырвонага перцу) і некалькіх галінак кропу (можна замяніць пятрушкай).

-2746-

ПЕРАЙМАЙ!

## Градка і кветнік

**Адны лічаць, што галоўнае на ўчастку — гэта кветнікі. А іншыя — што кветнікі толькі займаюць месца, а таму ўсе іх трэба знішчыць, а месца, якое вызвалілася, засадзіць бульбачкай. Але, падумаўшы, можна знайсці месца і гародніне, і кветкам. Прычым на адной градцы.**

Кветкі, пасаджаныя на градках з гароднінай, прыцягваюць пчол для апылення. Высокія расліны прыцяняюць ад сонца ніжэйшыя.

Спалучэнне кветкавых і агародніных культур дапамагае аслабіць напад пустазелля — напрыклад, настурка (яна сцелецца па зямлі, не даючы шанцаў разрасціся пустазеллю).

Многія травы выдзяляюць біялагічна актыўныя рэчывы, а таксама рэзка пахнуць, што не падабаецца тым або іншым відам шкодных насякомых. Напрыклад, садовая петунія абараняе бабовыя расліны. Выдзяленні з каранёў аксамітак памяншаюць паражэнне іншых раслін грыбковымі захворваннямі (асабліва фузарыёзам), а таксама абараняюць ад некаторых відаў нематоды. Смаўжы абыходзяць бокам настурку і календулу.



Чабор, аксамісткі і календула адганяюць тлю і іншых ад капусты. Таматы аддаюць перавагу суседству базіліку, гарчыцы, пятрушкі, шалфею, бо яны ствараюць надзейны шчыт ад шкоднікаў.

## Другое жыццё

● Зусім нікуды не вартая замша, рваная і ў плямах — каштоўны інвентар для хатняй уборкі. Дзякуючы багаццю капіляраў замша выдатна ўсмоктвае вільгаць, таму сурвэткі і анучкі з замшы ідэальна падыходзяць для мыцця вокнаў, кафлі і іншых гладкіх бліскучых паверхняў, бо яны, у адрозненне ад традыцыйных баваўняных ануч, зусім не пакідаюць валокнаў.

● Маленькія кавалачкі замшы варта захаваць, каб праціраць акуляры. Лепшага матэрыялу для догляду за оптыкай у прыродзе не існуе.

***Перш чым выкінуць поліэтыленавыя пакеты, падумайце:***

● выкарыстанымі поліэтыленавымі пакетамі вельмі зручна высцілаць смеццевае вядро, каб яно не пэцкалася. Дарэчы, поліэтыленавыя пакеты з ручкамі цалкам заменяць смеццевыя пакеты, якія трэба купляць, — выносіць у іх смецце значна зручней;

● калі вы трымаеце на кухні лісточкі з любімымі кулінарнымі рэцэптамі, каб не вышмальцаваць, укладзіце іх у поліэтыленавыя пакеты і заварыце гарачым нажом. Дарэчы, такія лісточкі з рэцэптамі можна пры дапамозе хуткасшывальніка сабраць у цэлы альбом;

● каб захаваць адчыненую таматную пасту, змясціце ў слоік поліэтыленавы пакет (або два для надзейнасці), вывернуўшы вонкі верхні край, і наліце ў яго ваду, каб выцесніць паветра;

● калі неабходна хутка зрабіць якую-небудзь брудную працу, а гаспадарчыя пальчаткі надзяваць не хочацца, іх выдатна заменяць поліэтыленавыя пакеты.

СЕЗОННЫЯ КЛОПАТЫ

## Адпраўляем у летнюю спячку

**Калі вы яшчэ не паспелі прыбраць цёплы абутак, то самы час гэта зрабіць.**

Ачышчаны ад гразі і адрамантаваны абутак прасушыце, змажце крэмам, набіце ўнутранасць старымі газетамі ці чым іншым, каб захавалася форма, і складзіце ў каробкі. Заадно ёсць магчымасць правесці «рэвізію». Палічкі стануць больш умяшчальнымі, калі выдаліце з іх абутак, які стаў не па памеры, выйшаў з моды ці проста згубіў таварны від.

-2747-

## ПАКІНЬ «СЛЯЗУ» НА ДНЕ

**Абавязковым быў абрад «хрыстосавання з мёртвымі». Дзеля гэтага гаспадыня (а ў некаторых выпадках гэта рабілі дзеці) брала вялікоднае яйка і качала яго крыж-накрыж па насыпе. Затым на прыбраную магілу «левым» бокам рассцілаўся абрус, на яго ставілася куцця з запаленай свечкай і ўсе астатнія стравы, кожнай з якіх трэба было патрошкі адкласці нябожчыку.**

● Пасля гэтага па кругу пускалі памінальную чарку (гаспадыня брала з сабой дзве чаркі — адну ставілі нябожчыку, другая павінна была паядноўваць тых, хто прыйшоў на могілкі) з гарэлкай. У чарку налівалася піцьво і перадавалася самаму старэйшаму сярод прысутных. Адну частку піцва той спачатку адліваў на магілу (зноў-такі: перш, чым сабе — продкам), другую чарку выпіваў сам, апошнюю частку — «слязу» — абавязкова пакідаў на дне. Затым чарку напаўнялі зноў і перадавалі наступнаму па ўзросце родзічу (ад старэйшых да маладзейшых, але толькі жанатых людзей!). І гэты чалавек дакладна паўтараў асноўны прынцып узгаданага этыкетнага правіла... Так чарка-чара хадзіла па колу тройчы. Калі ж за трэцім разам яна даходзіла да апошняга, то тое, што заставалася на дне, — так званыя «слёзы» — зноўтакі вылівалася на магілу.

● Што стаяла за «слязой», пакінутай кожным на дне чаркі? Род збіраўся каля магіл тых, хто пайшоў на «той» свет, разарваўшы (у сімвалічным плане) эстафету жыцця. Хаджэнне чаркі па крузе з «пераходнай слязой» было скіравана на тое, каб аднавіць, замкнуць, паяднаць галіны радаводнага дрэва.

● У эстафету родавай памяці ўключаўся і яшчэ адзін атрыбут — асвячонае ў храме яйка. Рытуальная надмагільна-хаўтурная трапеза распачыналася тым, што адно свянцонае яйка дзялілася на столькі кавалачкаў, колькі чалавек сабралася вакол магілы, і кожны з прысутных браў сваю долю.

● Фактычна на ўсіх сямейна-родавых святах беларусаў прысутнічала галоўная абрадавая страва, якая дзялілася паміж усімі прысутнымі і з'ўлялася сімвалам родава-абшчыннага адзінства. На радзінах дзялілі «бабіну кашу», на вяселлі — каравай, на пахаванні — куццю, на памінках — чарку «з гаротнай слязой».

● На могілках елі і гаварылі доўга. Добрым словам успаміналі памерлых родных, расказвалі гісторыі з іх жыцця, запрашалі прысесці за жалобны «стол» блізкіх і знаёмых.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

ПРАДАЕЦЦА

❐ Драўляны дом з гас. пабудовамі на хутары.
Тэл. 8 0177245501.

❐ Дом, гас. пабудовы ў Камянецкім р-не, кафля 1917 г.в.
Тэл. 8 029 2562103.

❐ Інвалідная каляска.
Тэл. 8 0171947044.

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Паляўнічы. Турыст. Стол. Дакумент. Канонік. Жарт. Тып. Бар. Апука. Аркан. Малі. Баярка. Фаўла. Яўка. Лак. Ном. Балет. Навіна. Цуг. Цар. Базіліка. Кузаў. Катар. Атам. Рана. Драп. Грыбнік. **Па вертыкалі:** Анекдот. Бортнік. Копія. Роўніца. Бок. Конаўка. Яхта. Ежа. Адамар. Нара. Атара. Растр. Этап. Тук. Баран. Часнок. Маг. Ладан. Бэз. Хала. Одум. Капулеці. Ідал. Латук. Рыбак. Ірак. Гарадок.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 2077. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12